Камандзір інжынернага дарожна-мостабудаўнічага батальёна падпалкоўнік Сяргей САМАРАКОЎСКІ і камандзір інжынерна-тэхнічнага батальёна маёр Дзяніс ВАСІЛЕВІЧ.

пахваліцца наяўнасцю бартавой тэхнікі. Такім чынам, вайскоўцы ўносяць і сваю лепту ў агульны каравай, а разам з тым удасканальваюць свае навыкі кіроўцаў.

І нават калі з-за прыроднай стыхіі ў хаце або кватэры знікне святло, на дапамогу таксама прыйдуць ваенныя інжынеры. Электрастанцыі магутнасцю 100 кВт, якія стаяць на ўзбраенні 7-га інжынернага палка, здольныя забяспечыць электраэнергіяй невялікі населены пункт, некалькі шматкватэрных жылых дамоў або аб'ектаў інфраструктуры.

НЕБЯСПЕЧНЫ «ЎРАДЖАЙ»

Даводзіцца ваенным інжынерам і рызыкаваць. Мініраванне і размініраванне — таксама іх поле дзейнасці. Без справы сапёры 7-га інжынернага палка не бываюць ніколі. То ў тым, то ў іншым рэгіёне Беларусі нагадваюць аб сабе «падарункі» Вялікай Айчыннай вайны. Даводзіцца абясшкоджваць боепрыпасы і на палігонах пасля ваенных вучэнняў.

Летась сапёры вызвалілі ад непрыемных «падарункаў» 20 аб'ектаў. Пік іх дзейнасці прыпадае на вясну, калі небяспечныя прадметы знаходзяць падчас палявых работ, і восень, калі насельніцтва, ідучы ў лес па ягады і грыбы, знаходзіць іншы «ўраджай». У асноўным трапляюцца боепрыпасы часоў Вялікай Айчыннай вайны.

— Выязджаем на аб'ект, калі ёсць нават адна такая знаходка: у любым выпадку, гэта пагроза для жыцця, — расказвае **камандзір інжынерна-сапёрнага батальёна кадра Павел РУДЗЬКОЎ.** — Бывалі выпадкі, калі ў адным месцы знаходзілі і больш за сотню боепрыпасаў. Помніцца, як у 2014 годзе ў Докшыцкім раёне, у Бярэзінскім запаведніку, паднялі з зямлі 165 мінамётных мін калібру 81 міліметр. Пасля даведаліся, што на гэтым месцы размяшчаліся баявыя пазіцыі савецкіх войск: акопы, бліндажы відаць і сёння. Але, нягледзячы на даўніну тых падзей, боепрыпасы вельмі добра захаваліся і ў любы момант маглі абарваць камусьці жыццё...

Паміж жыццём і смерцю шораз знаходзяцца і сапёры. Як прызнаецца Павел, пачуццё страху ёсць заўсёды. «Калі гэтага пачуцця няма, то ў сапёрнай справе рабіць няма чаго, — перакананы вайсковец. — Бясстрашным людзям тут не месца! Толькі лепш, калі сапёры, як і дактары, будуць без працы».

Павел Рудзькоў служыць у палку ўжо дзявяты год. Прыйшоў сюды пасля заканчэння Ваеннай акадэміі. З будучай прафесіяй вызначыўся яшчэ ў школе. Толькі ў мінулым годзе ён асабіста абясшкодзіў 539 боепрыпасаў. Усяго на рахунку хлопца 1076 выбухованебяспечных рэчываў, а магчыма, столькі ж і выратаваных жыццяў. На парадным кіцелі афіцэра — абсалютна заслужаны знак «За размініраванне» II ступені.

Калі размініраванне — звычайная практыка для сапёраў, то ў мірны час мініраванне адбываецца толькі ў мэтах навучання асабовага складу. Але, як той казаў, у кожным правіле ёсць выключэнні. І адным з іх з'яўляецца наўмысны падрыў аб'ектаў. Праўда, з такімі просьбамі да ваенных інжынераў звяртаюцца даволі рэдка. І, як прызнаюцца спецыялісты, замініраваць аб'ект значна складаней, чым яго размініраваць. Перш, чым узарваць пэўны аб'ект, трэба правесці спецыяльныя разлікі, падрыхтаваць месцы кладкі, закласці боепрыпасы — і толькі потым яго падрываць. Часам на гэта патрабуецца не адзін дзень.

ПАДВОДНЫЯ ІНЖЫНЕРЫ

«Падарункі» Вялікай Айчыннай вайны часам сустракаюцца і ў вадаёмах. Тут на дапамогу сапёрам прыходзяць ваенныя вадалазы. Яны абавязкова прысутнічаюць і пры абкатцы танкаў праз вадаёмы. Раптам машына заглухне або ўвогуле выйдзе са строю? У такім выпадку на дапамогу ім прыйдуць інжынеры ў вадалазных касцюмах. Любыя пошукавыя мерапрыемствы пад вадой — таксама ў іх кампетэнцыі.

Уражвае рыштунак вадалазаў. Цалкам такі камплект важыць 82 кілаграмы. Толькі адны галошы — 16-кілаграмовыя! Касцюм апранаецца з дапамогай 2 чалавек.

— Гэты рыштунак прызначаны для апускання на вялікія глыбіні, — уводзіць у курс справы **камандзір разведвальна-вадалазнага ўзвода лейтэнант Арцём ШАУРА.** — У ім можна апускацца да 60 метраў, у экстранных выпадках — да 80, але на непрацяглы час. Прызначаны касцюм яшчэ і для нізкіх тэмператур. Зімой апусціцца пад лёд у ім будзе камфортна. Ды і пад вадой у такой экіпіроўцы перасоўвацца нашмат лягчэй: ніякім цячэннем цябе не знясе. Вядома, ёсць на ўзбраенні палка і больш сучасныя вадалазныя касцюмы.

У такім рыштунку, які важыць 82 кілаграмы, ваенныя вадалазы апускаюцца пад ваду.

З ВОЙСКА — З ДЫПЛОМАМ

Салдаты тэрміновай службы спасцігаюць азы ваеннай інжынерыі не толькі ў аўдыторыях і майстэрнях. Яны актыўныя ўдзельнікі ўсіх акцый і мерапрыемстваў, у якіх задзейнічаны інжынерныя войскі. Са старэйшымі таварышамі па службе вайскоўцы ўзводзяць масты, будуюць дарогі, перавозяць збожжа і вызваляюць ад снегу аўтамабільныя магістралі. Ім, учарашнім прызыўнікам, давяраюць велікагрузную і спецыяльную тэхніку.

На стварэнне акопа для стральбы лежачы вайсковец не павінен затраціць больш за 30 хвілін. Калі ж у акопе лепш знаходзіцца стоячы, то неабходна ўкласціся ў паўтары гадзіны.

— Калі ў салдата няма правоў кіроўцы адпаведнай катэгорыі, то атрымаць іх ён мае магчымасць у арміі, — расказвае Дзяніс Васілевіч. — Вучым кіраваць і грузавой машынай з прычэпам, і аўтобусам. Толькі на самалёт правы не выдаём! *(Смяецца.)* Не маючы ніякіх навыкаў, у войску салдат таксама можа атрымаць як спецыяльнасць экскаватаршчыка, так і кранаўшчыка. Многія застаюцца ў нас па кантракце і працягваюць службу ў званні прапаршчыкаў. Або звальняюцца і на грамадзянцы ўладкоўваюцца кіроўцамі аўтатранспарту. Практычна ўсе спецыяльнасці, атрыманыя ў інжынерных войсках, запатрабаваныя ў грамадзянскім жыцці.

Вераніка КАНЮТА. *kanyuta@zviazda.by*

Павел РУДЗЬКОЎ за час службы асабіста абясшкодзіў 1076 боепрыпасаў.

тэхнікі для выратавання людзей, жывёл і прыроды.

Масты, пабудаваныя ваеннымі інжынерамі, стаяць не дзень і не два, нават не год. Яны служаць дзесяцігоддзямі і часам здольныя прапусціць машыны грузападымальнасцю да 60 тон.

«ХУТКАЯ ДАПАМОГА» ДЛЯ НАСЕЛЬНІЦТВА

Але не толькі мастамі і пераправамі воіны-інжынеры карысныя цывільнаму насельніцтву. Сваю ўніверсальнасць яны змаглі даказаць літаральна на днях, калі краіну засыпала снегам. Інжынерная тэхніка, як і тры гады таму падчас «Хаўера», з лёгкасцю ліквідавала наступствы магутных цыклонаў на дарогах Міншчыны.

Спраўляюцца вайскоўцы і з наступствамі іншых стыхій. «Два гады таму мы ўдзельнічалі ў культывацыі ляснога масіву пасля ўрагану ў Крупскім раёне, — гаворыць Сяргей Самаракоўскі. — А яшчэ раней, калі рака Бярэзіна была суднаходнай, эвакуявалі з яе патанулую баржу. За гэта не бралася нават МНС!»

Штогод інжынерную тэхніку можна ўбачыць і на жніве. Воіны-інжынеры дапамагаюць сельскай гаспадарцы ў розных рэгіёнах краіны: звычайна ў тых калгасах, якія не могуць

■ Унікальнае падраздзяленне

МАЙСТРЫ ДАРОЖНЫХ КАМУНІКАЦЫЙ

Спецыялісты транспартных войскаў — каштоўныя кадры і ў грамадзянскім жыцці

Калі краіну параўноўваць з арганізмам чалавека, то сардэчна-сасудзістая сістэма ў ёй — транспартныя камунікацыі. Быццам венамі і артэрыямі, Беларусь пранізана чыгуначнымі і аўтамабільнымі магістралямі. Транспартныя камунікацыі злучаюць гарады і вёскі, дзяржавы, нават кантыненты. Выкарыстоўваючы іх у сваіх мэтах, людзі ў пагонах уносяць важкі ўклад і ў развіццё сельскай гаспадаркі, абарончага сектара эканомікі, дапамагаюць насельніцтву вырашаць надзённыя праблемы.

Як цэласная сістэма транспартныя войскі Беларусі маюць небагатую гісторыю: яны былі створаны ў маі 2006 года на базе чыгуначных і аўтамабільных войскаў. Але і за гэты час зроблена нямала. Якімі буйнымі аб'ектамі мы абавязаны воінам-дарожнікам, чаму без гэтых спецыялістаў нельга ўявіць ніводзін узброены канфлікт і чым яны карысныя краіне ў мірны час — пра гэта і іншае мы пагутарылі з начальнікам дэпартамента транспартнага забеспячэння Міністэрства абароны генерал-маёрам Сяргеем НОВІКАВЫМ.

— Сяргей Ігнатавіч, стварэнне транспартных войскаў Рэспублікі Беларусь злучыла шматлікія віды камунікацый. Ці апраўдалася рашэнне аб'яднаць у адзіную сістэму чыгуначныя, аўтамабільныя і дарожныя войскі?

— Вывучаючы вопыт войнаў і ваенных канфліктаў, мы ўзялі лепшае, стварыўшы сістэму транспартнай бяспекі, у якую ўваходзяць чыгуначныя, аўтамабільныя і дарожныя войскі. Асноўным патэнцыялам транспартных войскаў з'яўляюцца падраздзяленні і воінскія часці, прызначаныя для гарантаванай аховы, тэхнічнага прыкрыцця, пры неабходнасці — аднаўленя і забеспячэння эфектыўнага функцыянавання транспартных камунікацый, найперш, штучных збудаванняў рознага прызначэння. Адзіная структура сістэмы транспартнага забеспячэння ўжо пацвердзіла сваю эфектыўнасць — як тая, якая адказвае сучасным рэаліям і здольная вырашаць увесь спектр надзённых пытанняў як у мірны, так і ў ваенны час. Стварыўшы ўнікальную ўніверсальную і цэласную сістэму, мы адаптавалі яе не толькі для Узброеных Сіл, а і для забеспячэння транспартнай бяспекі іншых войскаў і воінскіх фарміраванняў, у цэлым нашай дзяржавы.

— Найбуйнейшыя аперацыі Вялікай Айчыннай вайны не маглі абысціся без чыгуначнага транспарту, аўтамабільныя магістралі звязвалі фронт з тылам, а знакамітая дарога жыцця праз Ладажскае возера ўратавала не адну сотню тысяч чалавек... Якое месца транспартным камунікацыям адводзіцца ў сучасных узброеных канфліктах?

— Сапраўды, ніводная буйная аперацыя, якая праводзілася ў гады Вялікай Айчыннай вайны і ва ўзброеных канфліктах сучаснасці, не магла абысціся без удзелу як чыгуначных, так аўтамабільных і дарожных войскаў. Напрыклад, падчас аперацыі «Баграціён», у выніку якой Беларусь была вызвалена ад нямецка-фашысцкіх захопнікаў, сіламі транспартнага забеспячэння быў гарантаваны надзейны падвоз матэрыяльных сродкаў. У гэтым заслуга і 13 асобных чыгуначных брыгад, і аўтамабілістаў, якія перавезлі звыш мільёна тон разнастайных грузаў для дзейнай арміі. Асобныя часці, якія ўваходзяць у склад транспартных войскаў Рэспублікі Беларусь, — 30-я асобная Чырванасцяжная чыгуначная брыгада, 71-ы асобны пуцявы чыгуначны батальён і 77-ы асобны Чырванасцяжны маставы чыгуначны батальён — прайшлі вайну з першага па апошні дзень, зрабілі ўсё дзеля таго, каб савецкія войскі дайшлі да Германіі і заваявалі Перамогу.

Сёння роля транспартных войскаў у забеспячэнні транспартнай бяспекі ўзрасла шматкроць. Цяжка нават уявіць, што пэўная аперацыя будзе праведзена без адпаведнай тэхнікі, зброі, іншых матэрыяльных сродкаў і, вядома, транспартнай інфраструктуры. Мы забяспечваем жывучасць чыгуначных і аўтамабільных дарог, здольныя захоўваць і аднаўляць працаздольнасць транспартных камунікацый нават ва ўмовах дзеяння праціўніка, ажыццяўляць вайсковыя перавозкі.

(Заканчэнне на 4-й стар.)

■ Боегатоўнасць

ІСПЫТ НА АБАРАНАЗДОЛЬНАСЦЬ

Ва Узброеных Сілах працягваецца комплексная праверка гатоўнасці і здольнасці злучэнняў і вайсковых часцей выконваць задачы па прызначэнні

Напрыклад, падраздзяленні 11-й механізаванай брыгады пераадолелі водную перашкоду, раку Нёман, па пераправе, створанай ва ўмовах суцэльнага ледзянога покрыва. Маставая пераправа ў кароткі тэрмін была наведзена вайскоўцамі пантонна-маставога батальёна 557-й інжынернай брыгады з дапамогай спецыялістаў са 188-й гвардзейскай інжынернай брыгады і 7-га інжынернага палка.

У воінскіх падраздзяленнях, у якіх ажыццяўляецца праверка, працягваецца прызыў ваеннаабавязаных, праводзяцца заняткі па прадметах баявой падрыхтоўкі, адбываецца рэкагнасцыроўка раёнаў правядзення тактычных вучэнняў, камбінаваным спосабам здзяйсняюцца маршы ў раёны прызначэння, дзе адбудуцца мерапрыемствы баявога згладжвання і тактычныя вучэнні, у тым ліку з баявой стральбой.

Значная ўвага надаецца праверцы гатоўнасці ўзбраення, ваеннай і спецыяльнай тэхнікі па баявым прымяненні ў розных абставінах, у тым ліку пры нізкіх тэмпературах. У поўным аб'ёме ажыццяўляецца матэрыяльнае забеспячэнне воінскіх часцей і падраздзяленняў, якія выконваюць пастаўленыя задачы. Арганізаваны пункты абагрэву асабовага складу.

Вераніка КАНЮТА. *kanyuta@zviazda.by*

■ Без тэрміну даўнасці

ЗАБЫТЫ ДЗОТ

І дагэтуль невядома, ці маюць магілу партызаны, якія загінулі падчас баёў на Дняпроўска-Бугскім канале

У гісторыю партызанскага руху Беларусі баявыя дзеянні партызанаў у паўднёвай частцы Брэсцкай і былой Пінскай абласцей у лютым — сакавіку 1944 года ўвайшлі як 40-дзённая абарона Дняпроўска-Бугскага канала. Партызанская вайна прыняла тут формы сапраўднага фронту, з уласцівымі яму дзотамі і акопамі. Вывучаючы дакументы Нацыянальнага архіва, давялося аднавіць забытыя старонкі тых трагічных і разам з тым гераічных дзён.

На пачатку лютага 1944 года Чырвоная Армія вызваліла Роўна і Луцк. Пачаліся жорсткія баі за Ковель. Савецкія войскі, не сустракаючы вялікага супраціўлення, хутка прасоўваліся наперад па забалочаных тэрыторыях уздоўж правага берага Прыпяці. Яны маглі злучыцца з партызанамі, якія фактычна займалі тэрыторыю паміж Дняпроўска-Бугскім каналам і левым берагам Прыпяці, і апынуцца ў тыле 2-й нямецкай арміі, перарэзаўшы жалезную і шашэйную дарогі з Лунінца ў Брэст, па якіх забяспечваўся фронт. Але нямецкае камандаванне паставіла задачу ачысціць гэтую тэрыторыю ад партызанаў, знішчыць партызанскі аэрадром каля Сварыні і замацавацца на рацэ.

Лінія абароны

У наступленне супраць народных мсціўцаў немцы кінулі корпус групы войск «Агрыкола», куды ўваходзілі 23-я венгерская пяхотная дывізія і кавалерыйскі полк уласаўцаў. Пра тое, што немцы паспрабуюць выціснуць партызанаў з паўднёвай зоны Брэсцкай і Пінскай абласцей, партызанскае камандаванне даведалася яшчэ ў снежні 1943 года. Таму пачалі ствараць лінію абароны.

У выніку правядзення партызанскай аперацыі ў чэрвені 1943 года канал быў выведзены з эксплуатацыі. Партызаны брыгады імя Молатава Пінскага партызанскага злучэння пад камандаваннем Міхаіла Герасімава знішчылі шлюзы ў Оўзічах, Ляхавічах, Селішчы, Перарубе і Рагадошчы. Канал заставаўся толькі натуральнай перашкодай для наступлення ворага.

Поспех герасімаўцаў

У дваццатых чыслах лютага акупанты пачалі рух у напрамку канала. У цэнтры партызанскай абароны, на самым адказным участку, размясціліся народныя мсціўцы брыгады імя Молатава. Гэтая брыгада лічылася адной з самых баявых у Пінскім партызанскім злучэнні, а камбрыг Міхаіл Герасімаў быў любімцам камандзіра злучэння Васіля Каржа. Нават быў прадстаўлены ім да звання Героя Савецкага Саюза, але ўзнагароду так і не атрымаў.

«...40 дзён брыгада трымала абарону на Дняпроўска-Бугскім канале супраць пераўзыходзячых сіл немцаў, — паведамляецца ў характарыстыцы на Міхаіла Герасімава. — Байцы і камандзіры праявілі вялікую адвагу і вытрымку. Усімі дзеянямі брыгады кіраваў Герасімаў. Байцы заўсёды бачылі яго на самых адказных участках. Ніводны катар і баржа не прайшлі па канале — усе яны сталі трафеямі надыходзячай арміі. У Пінску было захоплена арміяй 170 адзінак рачных катараў і баржаў...».

На шляху — канал

Атрад імя Калініна брыгады імя Молатава заняў абарону ў раёне дарогі Белін — Мукашын, кантралюючы пераправу ля спаленага моста цераз Дняпроўска-Бугскі канал. Партызаны да абароны падрыхтаваліся загадзя. З дапамогай мясцовага насельніцтва пабудавалі на найболей адказных участках дзоты, дзе да пачатку лютага ўжо неслі баявое дзяжурства.

(Заканчэнне на 4-й стар.)

■ Землякі

Герой з брыгады «Матэоці»

У партызанскім атрадзе на Апенінах адважна змагаўся клімаўчанін

Пасля заканчэння ў 1941 годзе васьмі класаў Аляксею Кісялёву споўнілася ўсяго чатырнаццаць гадоў. А ў сорак трэцім ён быў вывезены акупантамі са сваёй роднай вёсачкі Стары Стан Мілаславіцкага сельскага Савета, што на Клімаўшчыне, у Нямеччыну.

У родных мясцінах засталіся трое яго братоў-сірот. Бацькі, Кірыла Яўціхавіч і Аляксандра Іванаўна, памерлі пасля цяжкай хваробы, калі Алёшу было яшчэ ўсяго шэсць гадоў.

З дапамогай італьянскіх патрыётаў Кісялёў здзейсніў смелыя ўцёкі з лагера і стаў байцом Гарыбальдзійскай партызанскай брыгады «Матэоці». Удзельнічаў у васямнаццаці баявых аперацыях.

Амаль за два папярэднія гады знаходжання на акупаванай тэрыторыі ў Беларусі падлетак люта ўзненавідзеў фашыстаў, якія здзекамі, катаваннямі, расстрэламі, спальваннямі і вывазамі моладзі ў Германію наводзілі на шматпакутнай беларускай зямлі свой «новы парадак». Толькі ў адной яго вёсцы (калгас «Краіна Саветаў») за гады вайны было спалена 122 двары і тры жыхары-старастанцы, яшчэ 24 чалавекі забралі ў нямецкае рабства. А з франтоў Вялікай Айчыннай, як потым стане вядома, не вернуцца дахаты 64 воіны-землякі — хто загіне, а хто прападзе без вестак на той вайне.

Вось і стаў Лёша Кісялёў на барацьбу з ненавісным ворагам, узяўшы ў рукі зброю. Восенню 1944-га яго атрад выбіваў немцаў з мястэчка Кастэляўчэ.

НАША ДАВЕДКА. *Гарыбальдзійскія брыгады аб'ядноўвалі амаль палову італьянскіх партызанаў і дзейнічалі ў Італіі ў перыяд акупацыі краіны фашысцкай Германіяй у 1943 — 1945 гадах. З сярэдзіны 1944-га па сакавік 1945 года яны правялі каля 6,5 тысячы баявых аперацый і больш як 5,5 тысячы дыверсій. У радах італьянскіх партызанаў з фашыстамі змагаліся звыш 5 тысяч савецкіх грамадзян. Магілы савецкіх воінаў можна адшукаць амаль у 200 італьянскіх гарадах і пасёлках.*

Здаецца, пасля бою ўсё сцішылася, немцы адступілі. Клімаўчаніна разам з таварышам па зброі паставілі на пост на пад'язных шляхах. Раптам хлопцы заўважылі набліжэнне пяхоты праціўніка да ўзводу. Аляксей, нягледзячы на сваю маладосць, прыняў самастойнае рашэнне: не ўзнімаць раней часу трывогі, каб не спалохаць фашыстаў. А ўдвух, хоць сілы былі зусім не роўныя, даць адпор, адкрыўшы з блізкай адлегласці па гітлераўцах нечаканы агонь. Трапныя чэргі патрыётаў амаль што ва ўпор выклікалі вялікі пярэпалах у стане ворага, які падбіраўся скрытна, каб запець антыфашыстаў нечакана. І немцы зноўку па-здрадніцку адступілі, пакінуўшы на дарозе восем трупаў.

Усяго толькі праз некалькі дзён, 2 кастрычніка 1944 года, у баях каля Капуньяна, што непадалёк ад горада Парэці, сямнаццацігадовы Аляксей Кісялёва, на жаль, загінуў. У знак удзячнасці ад італьянскага народа і ў памяць аб ім у Італіі на магіле ўдзельніка антыфашысцкага супраціўлення пастаўлены помнік. Ёсць пра яго радкі і ў раённай кнізе «Памяць», якія сведчаць пра тое, што подзвіг Аляксея Кавалёва не забыты і на радзіме. Засталося толькі адшукаць яго асабісты фотаздымак. Магчыма, дапамогуць у гэтым чытачы: герояў Айчыннай вайны трэба ведаць у твар.

Іван ЛАПО, краязнаўца,

г. Клімавічы

■

ЗАБЫТЫ ДЗОТ

(Заканчэнне. Пачатак на 3-й стар.)

З дакладной камандавання брыгады імя Молатава начальніку БШПР: «...Палкі венграў, маючы перавагу ў жывой сіле і тэхніцы, дзвюма калонамі 21-га лютага падышлі да Дняпроўска-Бугскага канала ў раёне Беліна і Зарэчкі... За пераправу на канале завязаліся ўпартыя жорсткія баі. Шлях праціўніку заступаў канал і наша абарончая лінія, якая цягнулася ад стыку каналаў Белаазёрскага з Дняпроўска-Бугскім да Вулькі Кужалічанскай па пяўднёвым беразе канала і была ўсеяная бліндажамі, дзотамі і бесперапыннымі хадамі зносін. Бой за пераправу на гэтых участках працягваўся трое сутак, і абяскроўлены праціўнік адкаціўся назад...»

Страты

Жорсткі характар баёў пацвярджаюць і мадзьяры. Толькі колькасць забітых і параненых венгерскіх салдатаў моцна адрозніваецца ад звестак партызанаў. Але гэта звычайная практыка ў любой вайне, калі ў данясеннях прыніжаліся свае страты і намнога павялічваліся страты праціўніка.

Са справаздачы атрада імя Калініна: «...21-22 лютага 1944 года ў лютым баі, паводле звестак агентурнай разведкі, за два дні бою праціўнік страціў забітымі 270 чалавек. Колькасць параненых не ўстаноўлена, але вызначаецца лічбай каля 100 чалавек. У гэтым баі знішчана нямецкая процітанкавая гармата і станкавы кулямёт, захоплены 1 ручны кулямёт».

Яны памятаюць

У Драгічыне жыве Ніна Кузняцова, у мінулым разведчыца атрада імя Калініна. Яна памятае абарону канала і расказала наступнае: «...Падчас баёў на канале я была ў Малінаўцы (тады Калонія Белін. — **Аўт.**): там штаб знаходзіўся. Нашы партызаны прывезлі з-за лініі фронту зброю і патроны. Далі мне 2 тысячы патронаў у пачках і сказалі занесці камандзіру ўзвода Удодаву, які знаходзіўся на канале ў дзоце. Патроны несла пад абстрэламі. Тады мяне і параніла ў галаву: шрам ад асколка дагэтуль застаўся».

У падрабязнасцях памятае тыя падзеі і былы партызан разведузвода атрада імя Калініна, а цяпер прафесар, доктар медыцынскіх навук Іван Данілаў:

— Асноўныя баі адбываліся 22 лютага. Мадзьяры білі галоўным чынам з гармат, таму ў дзотах на бічаўніку выстрымаць было немагчыма. Увесь дзень яны нас атакавалі. Камісар Мілюшын паслаў мяне ў цэнтральны дзот да камандзіра атрада Самаркіна даведацца, ці можна паспрабаваць акружыць мадзьяр. Я папоўз уздоўж бічаўніка. Па месцы, якое вяло да дзота, біў снайпер. Неяк праскочыў. У дзоце Юрый Самаркін з партызанамі вялі бой. Я далажыў, што Мілюшын прапануе абысці і акружыць мадзьяр. Самаркін адказаў, што гэта немагчыма... Мінамёты мадзьярскія ўвесь час працавалі. Дзоты былі разбіты гарматамі. Пакінуўшы першую лінію абароны, у ноч на 23 лютага перайшлі на другую лінію. Самаркін застаўся жывы, але быў паранены ў руку. Забітых пакінулі ў разбураным дзоце.

Не пахаваныя?

Тое, што ў дзоце засталіся забітыя партызаны, пацвярджае і нямецкі дакумент, у якім паведамляецца: «...У бандыцкіх бункерах на поўдзень ад канала выяўлены разбіты ручны кулямёт і процітанкавая стрэльба, а таксама 6 чалавек забітых. Вялікая колькасць забітых і параненых забраны бандытамі ці згарэлі ў хатах. Уласныя страты: 1 забіты, 4 паранены».



Схема баёў атрада імя Калініна на канале 21-22 лютага 1944 года.

У Нацыянальным архіве ў спісах загінулых у гэты перыяд партызанаў атрада імя Калініна значацца Васіль Юрасюк, Фёдар Вакульчык, Васіль Казека, Уладзімір Місавец, Ленгвін Усцінаў. У іншым дакументе таксама ўказаны Сцяпан Кахоўскі, які, хутчэй за ўсё, загінуў на мастку праз канал. Што тычыцца пахавання воінаў, у партызанскіх дакументах ёсць недакладнасці. У адным з іх у графе «месца пахаванняў» пазначана: «на могілках атрада імя Калініна», у іншым — «трупы не вынесены з поля бою».

Дырэктар драгічынскага Ваенна-гістарычнага музея імя Удовікава Сяргей Гранік, які даўно займаецца пошукам месцаў пахавання часоў вайны, лічыць, што ўсе палеглыя тады партызаны не былі пахаваны. «Рэальна гэта зрабіць было немагчыма, бо першую лінію абароны захапілі немцы, — расказвае ён. — Партызаны не хацелі казаць, што не вынеслі таварышаў з поля бою, а ў справаздачы напісалі, што пахавалі. Час быў такі. А больш пахаваць не было каму: немцы былі тут аж да вызвалення раёна ў ліпені 1944 года».

Тое, што забітых каля канала ніхто не хаваў, пацвярджае і сведка тых падзей, жыхар Беліна Міхаіл Бычык:

— Мадзьяры два бункеры каля парома разбілі, толькі трэскі ляцелі. З двух бункераў партызаны сышлі, а ў трэцім, які быў насупраць Белянка, яшчэ сядзелі. Мадзьяры падцягнулі туды гармату і пачалі страляць па дзоце. Пасля паслалі нашых мужыкоў да дзота: там трупы партызанаў ляжалі. Выцягнулі іх усіх да канала, а нас прывялі на іх глядзець і апазнаваць. Перакладчыкі-славакі пыталі: «Вы пазнаеце гэтых людзей? Яны прыходзілі да вас? Вы іх ведаеце, але не хочаце гаварыць!» Мы адказвалі, што яны нам незнаёмыя. Потым мадзьяры ўсіх забітых пакінулі каля канала.

У той жа час за каналам, недалёка ад хутара мясцовай жыхаркі Праскоўі Ваньковай, знаходзіцца месца ў выглядзе кургана, знешне падобнае на пахаванне. Гаспадыня хутара сцвярджае, што, па ўспамінах яе маці, там якраз і пахаваны забітыя партызаны.

Вымушаны адступаць...

У канцы сакавіка на станцыях Драгічын і Янова (цяпер гэта горад Іванава) для падмацавання венграў была выгружана нямецкая дывізія. Рыхтавалася новае наступленне на партызанскую зону. Брыгада імя Молатава ўстойліва трымала абарону. Баі працягваліся да канца сакавіка, і партызаны, адчуваючы недахоп боепрыпасаў, вымушаны былі адыходзіць ва Украіну.

У баях на канале ў адным з дзотаў загінулі партызаны з аддзялення Паўла Сенчука, якія мелі баявы вопыт і былі загартаваныя ў дыверсійнай вайне на чыгунцы. Сянчук пасля тых баёў застаўся жывы і за падрывы эшалонаў на чыгунцы і баі на канале быў узнагароджаны ордэнам Леніна. Абаронцаў дзота, якія засталіся там назаўсёды, не адзначылі нават пасмяротна. Аб геройскім баі народных мсціўцаў нішто не нагадвае, нават сціплы помнік. Цяпер каля старога моста, дзе стаяў цэнтральны дзот, працуе паромная пераправа, а па берагах канала выраслі дрэвы і хмызнякі.

Аляксандр ПАЎЛЮКОВІЧ,

г. Мінск.

МАЙСТРЫ ДАРОЖНЫХ КАМУНІКАЦЫЙ

(Заканчэнне. Пачатак на 3-й стар.)

— І ў мірны час транспартныя войскі выконваюць вялікую работу па будаўніцтве і аднаўленні аўтамабільных дарог і мастоў, абароне дарожных аб'ектаў і нават ліквідацыі наступстваў надзвычайных сітуацый...

— Наша задача — рыхтавацца не толькі да вайны, а і забяспечваць транспартную бяспеку ў мірны час. Транспартныя войскі ўдзельнічаюць у ліквідацыі наступстваў як тэхнагенных, так і катастроф прыроднага характару. Хто, як не мы, першымі ўключыліся ў працу па ачыстцы дарог ад снегу, які ў 2013 годзе прынёс цыклон «Хаўер», а нядаўна «Данізла» і «Эма»? У памяці — размыў дарожнага палатна ў Віцебску, якое праходзіла ўздоўж воднай перашкоды. Пайсці пад адхон цягніку не дазволілі нашы вайскоўцы, якія ў кароткі тэрмін накіраваліся да месца здарэння. Транспартныя войскі прыйшлі на дапамогу і тады, калі пры будаўніцтве аўтадарожнага моста праз Заходнюю Дзвіну ў раку ўпала 900 тон металу, якія перакрылі суднаходны рух па воднай магістралі. Аднавілі яго воіны-транспартнікі.

— Часам праца воінаў-дарожнікаў застаецца, што называецца, за кадрам. А між іншым, дзякуючы ім ваенная тэхніка і ўзбраенне своечасова трапляюць на палігоны, на якіх плануюцца адбыцца вучэнні. Летась мінамётныя залпы і кулямётныя чэргі грымелі ў розных месцах краіны і за яе межамі. Ці вытрымалі ваеннаслужачыя транспартных войскаў экзамен на прафпрыдатнасць?

— Мерапрыемствы па перакідванні войскаў на шматлікія адлегласці, у тым ліку на палігоны, якія летась былі задзейнічаны не толькі ў межах Саюзнай дзяржавы, а і ў межах АДКБ, паспяхова рэалізаваны. Сумесна з Міністэрствам транспарту і камунікацый, Беларускай чыгункай і «Белавіяй» мы заўсёды выбіраем найбольш эфектыўныя і эканамічныя спосабы перамяшчэння ўзбраення і тэхнікі. Безумоўна, удзельнічаючы ў падобных мерапрыемствах у мірны час, мы рыхтуем сябе да таго, каб у цяжкую хвіліну выканаць задачы ў любых абставінах. Але вельмі складана навучыць маставіка на палігоне. Таму спецыялісты-маставікі рыхтуюцца на рэальных аб'ектах транспартнай інфраструктуры рэспублікі, разам з тым удзельнічаючы ў дзяржаўных праграмах.

— Адна з іх — «Дарогі Беларусі». Што яшчэ за апошні час зроблена дэпартаментам у праектах, звязаных з рэальным сектарам эканомікі?

— У межах рэалізацыі дзяржаўнай праграмы «Дарогі Беларусі» ваеннаслужачымі транспартных войскаў на працягу апошніх гадоў наведзены аўтадарожныя масты агульнай працягласцю больш за тры кіламетры і семсот метраў, узведзена больш за 50 штучных збудаванняў. Пры рэканструкцыі аўтамагістралі Мінск — Гомель дзякуючы часоваму аўтадарожнаму мосту, наведзенаму праз раку Свіслач, быў істотна скарочаны час на будаўніцтва капітальнага моста, зніжаны выдаткі на яго ўзвядзенне. Пры правядзенні капітальнага рамонту аўтадарожнага моста праз Дняпро ў Шклове штатная маёмасць транспартных войскаў дазволіла пазбегнуць лішніх выдаткаў і было эканомлена больш як 12 мільярдаў рублёў. Акрамя таго, ваеннаслужачыя ўдзельнічаюць у праграме «Развіццё і ўдасканаленне дарог Беларусі», выконваюць задачы па інжынерным абсталяванні дзяржаўнай мяжы. Нашу маёмасць мы выкарыстоўваем і пры рэалізацыі дзяржаўнай праграмы будаўніцтва гідраэлектрастанцый. Праз краіну праходзяць шматлікія транспартныя калідоры. І наша задача — стварыць бяспечныя ўмовы для праходжання грузаў, увогуле засцерагчы ад небяспекі ўсю транспартную інфраструктуру краіны.

— Ці здольная тэхніка, якая стаіць на ўзбраенні транспартных войскаў, вырашаць усе надзённыя задачы? Як часта абнаўляецца аўтамабільны парк?

— Транспартныя войскі валодаюць унікальнымі матэрыяльнымі сродкамі, якія дазваляюць у кароткі тэрмін аднавіць рух транспарту, маецца сур'ёзны патэнцыял тэхнікі. Ужо абноўлена каля 30% узбраення і тэхнікі. Што тычыцца аўтамабіляў, самазвальны і грузавы паркі абноўлены амаль цалкам, прычым тэхнікай айчыннай вытворчасці. Але каб гарантавана забяспечыць транспартную бяспеку, мы павінны мець на ўзбраенні не толькі магутныя машыны, а і тыя спецыяльныя сродкі, якія за непрацяглы час дазваляюць выканаць комплекс мерапрыемстваў па аднаўленні руху транспарту. Тут абнаўленне адбылося на 20%. Праходзіць мадэрнізацыю маставая маёмасць.

Хачу адзначыць унікальнасць тэхнікі вытворчасці Мінскага аўтамабільнага завода. Такія камбінаваныя сродкі, як лакамабілі, здольныя рухацца як па аўтадарогах, так і па рэйках, заехаўшы на іх з любога ўчастка і працягваючы рух па чыгунцы. Гэтыя машыны з дапамогай усяго аднаго спецыяліста здольныя выканаць цэлы комплекс мерапрыемстваў, у тым ліку па бездарожжы. Напрыклад, 20-тонныя самазвалы апраўдалі сябе падчас працы на спартыўных аб'ектах: летась ваеннаслужачыя ўдзельнічалі ў рэканструкцыі лыжароднага комплексу «Заечая паляна», дзе рыхтуюцца нашы біятланісты. Такім чынам, тэхніка, якая стаіць на ўзбраенні транспартных войскаў, можа эфектыўна забяспечыць выкананне шмат якіх задач.

«Удзельнічаючы ў падобных мерапрыемствах у мірны час, мы рыхтуем сябе да таго, каб у цяжкую хвіліну выканаць задачы ў любых абставінах».

— А дзе можна атрымаць дыплом воіна транспартных войскаў? І якім чынам трапіць да вас прызыўніку?

— Спецыялістаў-прафесіяналаў рыхтуюць у Ваеннай акадэміі, на ваенна-транспартным факультэце Беларускага дзяржаўнага ўніверсітэта транспарту. Акрамя таго, адпаведную адукацыю можна атрымаць і ў Санкт-Пецярбургу: у Ваенным інстытуце чыгуначных войскаў і ваенных зносін, Ваеннай акадэміі матэрыяльна-тэхнічнага забеспячэння. Падрыхтоўку малодшых спецыялістаў мы ажыццяўляем у Слуцку, дзе створана добрая вучэбна-матэрыяльная база.

Для таго, каб трапіць у транспартныя войскі, па-першае, прызыўнік павінен хацець служыць. Па-другое, быць мужным, фізічна падрыхтаваным. Вітаецца наяўнасць тэхнічнай адукацыі па спецыяльнасці. Калі ж яе няма, то ён абавязкова атрымае спецыяльнасць у войску. Вы ўяўляеце, колькі падрыхтавана прафесіяналаў для транспартнай галіны толькі пры ўдзеле ваеннаслужачых у праграме «Дарогі Беларусі»?! Пасля звальнення з Узброеных Сіл такі салдат ніколі не застанецца без працы, бо будзе валодаць надзейнай спецыяльнасцю, якая карыстаецца попытам у грамадзянскім жыцці. Адсюль — і вялікае жаданне служыць у нас.

Вераніка КАНЮТА. *kanyuta@zviazda.by*

■ Гісторыя маёй сям'і

«БЫЦЦАМ ФІЛЬМ ПРА ВАЙНУ ПАГЛЯДЗЕЛІ...»

У той дзень у Рыбцах загінулі 143 чалавекі

Цёплы майскі дзень 1965 года. Дзень Перамогі! Мой бацька, Рыгор Іванавіч Молчан, яшчэ зранку надзеў святочную кашулю, прымацаваў да яе ордэн Айчыннай вайны, ордэн Славы, медаль «За перамогу над Германіяй»... І паехаў разам з іншымі ветэранамі ў цэнтр калгаса «Барацьба» — вёску Зазерка — на мітынг. Маці гатавала абед. А мы з любімай бабуляй выйшлі ў двор і селі на лавачцы.

На вачах Марыны Вальковіч гітлераўцы забілі ўнукаў і цяжарную дачку.

Да вялікага помніка, што стаіць каля школы, падышла група моладзі. Дзяўчаты і хлопцы разгледзелі фігуру партызана, высечаную з каменю, і абеліскі па баках з дзясяткамі імёнаў, многія з якіх паўтараюцца, — на вайну ішлі сем'ямі. Пастаяўшы крыху і ўсклаўшы кветкі, студэнты перайшлі вуліцу і, апынуўшыся ў нашым двары, папрасіліся адпачыць з дарогі і наталіць смагу. Бабуля Марына, невысокая, у белай хустачцы, са зморшчаным тварам і добрымі вачыма, падышла да калодзежа і стала набіраць ваду. Я вынесла з хаты кубачкі. Па чарзе ўсе напіліся сцюдзёнай вадзіцы, а потым папрасілі гаспадыню, Марыну Васільеўну Вальковіч, расказаць пра помнік.

— Ой, цяжка мне гэта ўспамінаць, — казала яна. — Але трэба, каб вы, маладзенькія, ведалі праўду і бераглі ў памяці ды сваім дзеткам потым расказвалі. Не дай Бог такому паўтарыцца!

Студэнты расселіся на лаўцы, на траве, на бервяне і быццам фільм пра вайну паглядзелі — так цікава апавядала бабуля Марына, часам выціраючы старэчыя слёзы рагамі сваёй хустачкі... А я, тады 13-гадовая школьніца, ужо каторы раз зноў выслухала знаёмую да болю гісторыі маёй сям'і.

Вось што расказвала бабуля:

«Праз вёску нашу праходзіць чыгунка, і партызаны, што пачалі дзейнічаць у вайну ў мясцовых лясах, часта выкарыстоўвалі зручныя падыходы да яе, каб падрываць нямецкія эшалоны. Тое ж было і ў суседніх вёсках. Не дзіва, што ўсе населеныя пункты каля чыгункі фашысты лічылі партызанскімі. Зімой 1942—1943 гг. немцы асабліва лютавалі. Паўсюдна праводзілі карныя аперацыі: палілі вёскі, забівалі жыхароў. А дапамагалі ім здраднікі-паліцаі. Нехта з іх у вёсцы Зазерка зрабіў для немцаў спіс усіх партызанскіх сем'яў. І вось у лютым 1943 года былі спалены толькі хаты тых людзей, з чыіх сем'яў хоць хто-небудзь быў у партызанах. І народу шмат забілі. Дайшлі чуткі, што неўзабаве тое ж будзе і з нашай вёскай.

«У двор зайшоў фашыст, даў чаргу з аўтамата па вокнах, убачыўшы там дзіцячыя тварыкі. Умомант усе дзеці пасыпаліся на падлогу».

У мяне сямёра сыноў і дачок было тады. Іван, Валодзя і Ульяна пайшлі ў партызаны разам з бацькам. Волька, замужняя, мела ўжо траіх дзяцей, жыла за сем кіламетраў у Варонічах. Да яе і адправіла ў той жудасны дзень сваіх меншанькіх дзяўчат-падлеткаў Ніну і Яўгенню. Ледзь паспелі яны дабегчы да лесу, як Рыбцы ўжо былі акружаны карнікамі. Ганна, самая старэйшая, жыла з мужам Сцяпанам Драздом і чацвярымі дзеткамі асобна, у сваёй хаце ў Рыбцах. Вось-вось павінна было з'явіцца на свет іх пятае дзіцятка. Дык мы напярэдадні падрыхтаваліся да карнай аперацыі: перанеслі пажыткі ў хату Ганны, а яшчэ свінчо да яе ў хлеў загналі. Рахманая такая свінка была, ручная, нікога не баялася. Сцяпан разам з іншымі мужчынамі зранку паехаў жыта змалоць у суседнюю вёску. Лілечка, старэйшая мая ўнучачка, так прасілася: «Татачка, вазьмі мяне з сабой!» А ён вырашыў, што спакайней будзе дачцэ з маці, і пакінуў яе дома.

Ну, а я пайшла да Ганны: раптам роды пачнуцца? Многія жыхары вёскі зрабілі тады так, як і мы: хто ў іншыя вёскі да радні пайшоў, хто да сваіх у Рыбцы разам са скарбам ды жывёлай перабраўся — усе думалі, што спаляць канкрэтныя хаты. Але здарылася ўсё не так. Карнікі дакладна не ведалі партызанскіх сем'яў у вёсцы. Яны забралі Якава, пажылога чалавека, і пад дулам аўтамата загадалі паказаць усе патрэбныя ім хаты. Той не пагадзіўся, за што яго і расстралялі. Разазлаваны няўдачай нямецкі афіцэр аддаў загад паліць усю вёску. Тут і пачалося самае жахлівае. Карнікі з факеламі падпальвалі хаты, стралялі па ўсіх, хто трапляў на вочы.

Помнік загінулым жыхарам вёскі Рыбцы. На абелісках — больш за сотню імёнаў.

Ганна прасіла дзяцей схавацца, а малым жа цікава было, што на вуліцы робіцца. Паселі яны на лаўках перад вокнамі: Ліля с Галяй у адным акне, Геня і Колечка — у другім. Я ля печы завіхалася, ваду грэла. Раптам пачалася страляніна. У двор зайшоў фашыст, даў чаргу з аўтамата па вокнах, убачыўшы там дзіцячыя тварыкі. Умомант усе дзеці пасыпаліся на падлогу. Не паспела я зразумець, ці ўнукі параненыя, ці адразу загінулі, бо ў хату зайшоў паліцай, і мы з Ганнай кінуліся хавацца за печ (а яна так была зроблена, што ўкругавую можна было каля яе прайсці). Ды не паспела дачушка мая, дагнала яе куля. Прама ў жывот трапіў вырадак гэты, потым яшчэ раз выстраліў. А я выскачыла з другога боку печы — ды на двор. Хата ўжо гарыць, хлеў адчынены, свінка бегае, вішчыць. Вельмі мне страшна стала. Узяла я ды кінулася на зямлю. Думаю: хай забівае так. Падбегла да мяне свінка, круціцца вакол, а немец, што падпальваў хату, страляе ў мяне. Прашыў парасё наскрозь, а я ляжу, не зварухнуся нават. Горача зрабілася, бо ўсё вакол гарыць, хата палае. Немец пайшоў далей, я крыху адпаўзла да вішань, з'ела прыгаршню снегу. Самае жудаснае было ў тым, што нічым не магла ўжо дапамагчы сваім родненькім. Хоць, можа, яшчэ і жывыя яны гарэлі... Хаты ж тады былі драўляныя, а стрэхі — з саломы. Згаралі імгненна.

Вечарам і на наступную раніцу збіраліся ў Рыбцах на пажарышчах тыя, хто ўцалеў. Людзі знаходзілі костачкі згарэлых родных, збіралі іх і везлі хаваць на могілкі. У той дзень у вёсцы загінулі 143 чалавекі. Іх прозвішчы і пералічаны на абелісках каля школы...»

Бабуля Марына згорбілася — здавалася, яшчэ больш пастарэла ад цяжкіх успамінаў, — але зноў загаварыла:

«Вельмі ж гаравaў тады мой зяць, як вярнуўся з млына, ледзь валасы на сабе не рваў ад таго, што не забраў з сабою старэйшую дачушку: хоць бы яна жывая засталася. Стаў і ён партызаніць, а ў 1944-м, як вызвалялі гэтыя мясціны, пайшоў на фронт. Некалькі лістоў ад яго атрымалі, і ва ўсіх самымі галоўнымі словамі былі вось гэтыя: «Усе мае таварышы гінуць, а мяне кулі не бяруць. Помшчу за сям'ю». І ўсё ж пад Берлінам у 1945 годзе загінуў і сам. На фронце прапаў без звестак і яшчэ адзін мой зяць, муж Вольгі Іван Сарока. Толькі нядаўна даведаліся яго дзеці, унукі мае, што пахаваны ён у Польшчы ў брацкай магіле. Слава Богу, усе астатнія мае дзеткі засталіся жывымі...»

«Вечарам і на наступную раніцу збіраліся ў Рыбцах на пажарышчах тыя, хто ўцалеў. Людзі знаходзілі костачкі згарэлых родных, збіралі іх і везлі хаваць на могілкі».

Дзяўчаты і хлопцы сядзяць як скамянелыя. Ніхто не адважваецца зноў загаварыць. І гэта толькі адзін эпізод трагедыі спаленай у лютым 1943 года вёскі Рыбцы Рудзенскага раёна (цяпер Пухавіцкага).

Ужо даўно няма маёй бабулі, маіх бацькоў, няма цётак і дзядзькоў... Але і сёння помніца, як кожны з іх са слязьмі на вачах расказваў пра той жудасны час. Цяпер расказваю я, ужо сваім унукам, каб, як казала бабуля Марына, «не дай Бог такому паўтарыцца!..»

Ірына КАРТАШОВА,

г. Заслаўе

■

Краіна здароўя

Выпуск № 1 (354)

■ У руху

ПАЧЫНАЕМ РАНІШНЮЮ ГІМНАСТЫКУ!..

Недахоп актыўнасці адмоўна адбіваецца на арганізме, яго развіцці і рабоце многіх органаў

Калі мы доўга сядзім, дыханне становіцца неглыбокім, абмен рэчываў паніжаецца, адбываецца застой крыві ў нагах, засцерагае ўрач-метадыст 3-й гарадской дзіцячай клінічнай паліклінікі г. Мінска Галіна САФРОНАВА. Гэта зніжае працаздольнасць арганізма, аслабляе памяць, зніжае ўвагу, павялічвае час на разумовыя аперацыі. Адмоўныя наступствы праяўляюцца і ў зніжэнні супраціўляльнасці прастудным і інфекцыйным захворванням. А на фоне празмернага харчавання з лішкам вугляводаў і тлушчаў можа развіцца атлусценне. У нерухавых дзяцей слабыя мышцы. Яны не ў стане падтрымліваць цела ў правільным становішчы, таму ў іх парушаецца постаць.

Наш першы сябар на шляху да актыўнага руху — ранішняя гімнастыка. Выконваць яе можна і дома, і на вуліцы, прычым, усёй сям'ёй.

10—12 практыкаванняў павінны быць разлічаны на работу ўсіх асноўных груп мышцаў — рук, ног і тулава. Працягласць занятку — 15—20 хвілін. Частата пульсу пасля занятку не павінна перавышаць 110—120 удараў у хвіліну. Праз 5—10 хвілін паказчыкі павінны вярнуцца да нормы.

Падбіраючы комплекс, трэба ўлічваць узрост і ступень фізічнай падрыхтаванасці. Нагрузку рэгулюйце павелічэннем або змяншэннем колькасці паўтораў практыкаванняў, зніжэннем або павышэннем тэмпу. Паступова можна перайсці да практыкаванняў з гантэлямі, гімнастычнымі палкамі. Пасля зарадкі рэкамендуюцца водныя працэдуры: душ, абціранні, абліванні — што больш падабаецца.

МАМАМ І ТАТАМ

Вельмі карысная для здароўя хада — яна натуральная, даступная і лёгка дазуецца. Практыкаваць лепш за ўсё ў вячэрні час. Пры хуткасці 50—80 крокаў за хвіліну, пры даўжыні кроку 50—70 см — можна адолець каля 2 км за 30 хвілін. Пачаўшы з аднаго кіламетра, павялічвайце дыстанцыю, каб маршрут склаў 3—5 км. Падчас хады трэба сачыць за постаццю, раўнамерна і свабодна дыхаць.

Хадзіць трэба размераным крокам, у лёгкім і зручным адзенні. Найлепшы час для хады — да яды або праз 1,5—2 гадзіны пасля яе. Скончыўшы хадзіць, зрабіце некалькі лёгкіх практыкаванняў на расслабленне, прыміце душ.

Недастатковая мышачная актыўнасць стала характэрнай рысай жыцця не толькі дарослых, але і дзяцей.

БАБУЛЯМ І ДЗЯДУЛЯМ

Многіх людзей з катэгорыі «60+» захапіла скандынаўская хада з палкамі. Заснавальнікамі яе можна лічыць фінскіх лыжнікаў, якія баяліся за лета страціць форму. Аднак такі від фізічнай актыўнасці будзе карысны абсалютна ўсім, асабліва людзям з парушэннем дыхання, кровазвароту, астэахандрозам і лішняй вагой. Скандынаўская хада выдатна ўмацоўвае мышцы спіны, грудной клеткі, плячэй, рук, паляпшае кровазварот і абмен рэчываў. Пры гэтым забяспечваецца гімнастыка для суставаў, зніжаецца нагрузка на пазваночнік і суставы, што важна пры павышанай вазе. Дарэчы, хада з палкамі спальвае на 50 працэнтаў больш калорый, чым звычайная ■

■ Асаблівыя лекі

Абвінавачваецца... самалячэнне

ШТО ТРЭБА ВЕДАЦЬ І РАБІЦЬ, КАБ АНТЫБІЁТЫКІ НАМ ДАПАМАГАЛІ?

Напэўна ўсе чулі пра новую праблему чалавецтва: мікраарганізмы ўсё часцей дэманструюць устойлівасць да лекаў, закліканых ратаваць ад захворванняў, абумоўленых гэтымі нябачнымі агентамі. Праблема ў тым, што чалавека яшчэ не было, а вось мікробы дакладна існавалі, а таму ў іх большая практыка выжывання. А калі ўжо жыць ім хочацца не менш, чым чалавеку, то і рабіць яны для гэтага будуць усё магчымае — прыстасоўвацца да самых шкодных умоў, у тым ліку да лекаў-забойцаў. З аднаго боку, антыбіётыкі ўсё яшчэ дапамагаюць чалавеку, але цяпер ужо не ўсім і не заўсёды. Ёсць такія хворыя, якім у барацьбе з бактэрыялагічным захворваннем не дапамагае вялікая колькасць добра вядомых прэпаратаў, а ёсць і тыя, каму не дапамагаюць усе вынайдзеныя на сёння прэпараты (галоўным чынам размова ідзе пра людзей, якія атрымліваюць лячэнне ў аддзяленнях інтэнсіўнай тэрапіі і рэанімацыі). Хоць трэба аддаць належнае: вучоныя старанна вынаходзяць усё новыя і новыя лекі гэтага шэрагу. Што стала прычынай такога неспрыяльнага для чалавецтва становішча? Галоўным чынам бескантрольнае ўжыванне антыбіётыкаў. Абвінавачваюць і самалячэнне, і актыўнае выкарыстанне такіх прэпаратаў у жывёлагадоўлі (для хутчэйшага прыросту і барацьбы з інфекцыямі).

— Выкарыстанне ветэрынарных прэпаратаў, у тым ліку антыбіётыкаў, у жывёлагадоўлі ажыццяўляецца ў адпаведнасці з інструкцыямі па іх выкарыстанні, — адзначае **начальнік упраўлення кантролю за супрацьэпізаатычнай і прафілактычнай работай дэпартамента ветэрынарнага і харчовага нагляду Міністэрства сельскай гаспадаркі і харчавання Рэспублікі Беларусь Аляксандр ЛЯХОЎСКІ.** — Дадаткова, каб атрымаць бяспечную прадукцыю жывёлагадоўлі, яна кантралюецца на наяўнасць шкодных рэчываў, у тым ліку антыбіётыкаў. Нормы становяцца год ад года больш жорсткімі. Можна сказаць, што сёння яны больш жорсткія, чым у шэрагу еўрапейскіх краін. Разам з тым распрацоўваюцца, у тым ліку беларускімі вучонымі, новыя вакцыны для прафілактыкі захворванняў, а таксама лекі, якія замянялі б антыбіётыкі (на аснове прэ- і прабіётыкаў). Хоць цалкам адмовіцца ад прымянення антыбіётыкаў не атрымаецца. Таму што сельская гаспадарка — гэта масавая вытворчасць, і верагоднасць распаўсюджвання хвароб там надзвычай высокая. Пры гэтым для ветэрынарных прэпаратаў, у тым ліку і для антыбіётыкаў, вызначаюцца нормы іх увядзення і тэрмін вывядзення з арганізма жывёлы. Па завяршэнні такога тэрміну ні лекаў, ні іх рэшткаў у мясе ці іншай прадукцыі ўжо гарантавана няма.

Нездарма высокадазаваны ібупрафен 400 мг (і больш), асабліва ў камбінацыі з парацэтамолам, быў аднесены ў нас да рэцэптурных лекаў.

Паводле слоў **галоўнага пазаштатнага спецыяліста па клінічнай фармакалогіі Міністэрства аховы здароўя Рэспублікі Беларусь, дацэнта кафедры клінічнай фармакалогіі Беларускага дзяржаўнага медыцынскага ўніверсітэта Ларысы ГАЎРЫЛЕНКІ,** станоўчым з пункту гледжання бяспекі момантам з'яўляецца і тое, што падчас гатавання ежы, тэрмічнай апрацоўкі мяса, малака і г.д. адбываецца змяненне саставу прэпарата. «Антыбіётыкі ўплываюць не толькі на адчувальнасць і ўстойлівасць да іх, але і на метабалічныя працэсы арганізма, хоць ацаніць маштаб і спецыфіку гэтага ўплыву даволі няпроста. Тым не менш Міністэрства аховы здароўя стварыла рабочую групу, якая будзе ацэньваць усю праблему ў комплексе, у тым ліку рацыянальнасць прызначэння антыбіётыкаў».

Для Беларусі сёння праблема рэзістэнтнасці (устойлівасці) да антыбіётыкаў актуальная, дадае **дацэнт кафедры інфекцыйных захворванняў Беларускага дзяржаўнага медыцынскага ўніверсітэта Юрый ГОРБІЧ.** «Там, дзе прымяняюцца такія прэпараты, ёсць і ўстойлівасць да іх. Кожнае ўжыванне антыбіётыку — гэта цаглінка ў фарміраванне ўстойлівасці. Чым больш іх прызначаць, тым больш будуць прыстасоўвацца мікраарганізмы. Вырашацца гэта можа двума метадамі — абмежаваннем выкарыстання або пастаянным вынаходствам новых лекаў. Дарэчы, сам працэс распрацоўкі і першай рэгістрацыі прэпаратаў займае ад 3 да 7 гадоў (амаль год мінае з моманту рэгістрацыі навінкі за мяжой да яе рэгістрацыі ў нашай краіне). Каштуюць распрацоўкі мільярды долараў... Трэба разумець, што асноўная праблема для некаторых замежных краін — наяўнасць у бальнічным асяроддзі мікраарганізмаў, неадчувальных да большасці, а ў некаторых выпадках і да ўсіх існуючых антыбіётыкаў. Гэта выдаляе з арсеналу ўрачоў велізарны блок лекаў і пакідае магчымасць выкарыстання толькі рэзервовых».

Для нашай краіны праблема заключаецца да нядаўняга часу ў магчымасці набыцця антыбіётыкаў без рэцэпту. Няма чалавека, які хаця б раз у жыцці не набываў іх менавіта такім чынам. Увядзенне кантролю за продажам лекаў па рэцэпце знізіла колькасць рэалізацыі антыбіётыкаў у нашых аптэках на трэць. Значыць, амаль кожны трэці антыбактэрыяльны прэпарат ужываўся ў нас проста так, ад чаго заўгодна — і ад насмарку, і ад болю ў жываце, ды яшчэ з інструкцыяй многія забывалі азнаёміцца! Прымалі як на сэрца лягло: праз тры дні стала лягчэй — адмянялі. А ў выпадку з антыбіётыкамі гэта вельмі згубная практыка. Калі такія лекі прызначае ўрач, ён улічвае адзін важны момант — дозу і працягласць ужывання, якія вызначаюць і магчымасць вынішчэння мікраарганізма, і мінімальную рызыку развіцця ўстойлівасці да гэтага прэпарата.

Сёння дакладна ўстаноўлена, што антыбіётыкі не валодаюць супрацьвіруснай актыўнасцю. Аднак бывае, што пры вірусным захворванні ўрач усё ж такі прызначае антыбіётык. Як жа так? Аказваецца, урач можа ўлічваць небяспеку развіцця далейшага бактэрыяльнага ўскладнення пры тым жа грыпе, востры рэспіраторнай вірусной інфекцыі.

Прызначаць антыбіётык на фоне вірусной інфекцыі з мэтай прафілактыкі бактэрыяльнага ўскладнення можна, але не ўсім. Адна справа, калі грып напаткаў маладога чалавека без хранічнай паталогіі (верагоднасць развіцця ўскладнення ў такім выпадку меншая за 1 працэнт), і зусім іншая — калі гэта пацыент пажылы, з некалькімі цяжкімі хранічнымі паталогіямі, або калі ў пацыента ёсць выяўлены імунадэфіцыт, верагоднасць развіцця ўскладненняў пры якім дасягае 90 працэнтаў.

— Мы лечым не захворванне, а пацыента, — тлумачыць Ларыса Гаўрыленка. — А ў кожнага пацыента ёсць свой індывідуальны профіль. Асноўным захворваннем можа быць грып, але ён можа спалучацца з хранічнай абструктыўнай хваробай лёгкіх, іншай хранічнай інфекцыяй. Вынікі аналізаў падкажуць нам, ці ёсць верагоднасць абвастрэння гэтых станаў. Калі ёсць, значыць, антыбіётык можа стаць мерай прафілактыкі.

Амаль кожны трэці антыбактэрыяльны прэпарат ужываўся ў нас проста так, ад чаго заўгодна — і ад насмарку, і ад болю ў жываце, ды яшчэ з інструкцыяй многія забывалі азнаёміцца!

На вялікі жаль, тое, што кажа ўрач, у нашай краіне чамусьці падвяргаецца сумненню. Узнікае жаданне абмеркаваць яго словы са знаёмымі, пераправерыць у інтэрнэце... Чамусьці абсалютна ігнаруюцца ў якасці рэкамендацый такія парады, як піць больш цёплай вадкасці, вытрымліваць пасцельны рэжым. А між тым гэта зусім не пустыя словы. Літаральна яны азначаюць два моманты. Па-першае, абмежаванне фізічнай нагрузкі — каб арганізм займаўся толькі тым, што найбольш важна для яго цяпер; і, па-другое, дэзынтаксікацыю — вывядзенне з арганізма таксічных прадуктаў... Мала хто надае ўвагу і таму, як правільна прымаць спецыфічныя прэпараты — а менавіта, запіваць вялікай колькасцю вады. Менавіта вады! Нездарма высокадазаваны ібупрафен 400 мг (і больш), асабліва ў камбінацыі з парацэтамолам, быў аднесены ў нас да рэцэптурных лекаў. Аналіз бяспекі паказаў, што яго ўжыванне ў якасці гарачкапаніжальнага сродку, асабліва, калі яно не забяспечваецца дастатковай колькасцю вадкасці, надзвычай таксічна ўздзейнічае на ныркі, што можа скончыцца шпіталізацыяй. Заўсёды запівайце таблеткі звычайнай пітной вадой і ў дастатковай колькасці. Так вы забяспечыце неабходную біядаступнасць, эфектыўнасць і бяспеку ■

ПРАВІЛЫ ЎЖЫВАННЯ АНТЫБІЁТЫКАЎ

• Не прымайце антыбіётык у першыя тры дні вострай рэспіраторнай вірусной інфекцыі. Калі вы будзеце вытрымліваць пасцельны рэжым і піць шмат вады, абавязкова адчуеце палёгку і без «хіміі», калі ж не — звяртайцеся да ўрача.

• Нават калі тэрмін прыдатнасці прэпарата скончыўся ўсяго месяц таму, яго трэба выкінуць, а не імкнуцца выкарыстаць («абы не прапаў»).

• Запівайце таблетку шклянкай звычайнай пітной вады.

Паводле рэкамендацый рацыянальнага ўжывання медпрэпаратаў Сусветнай арганізацыі аховы здароўя, лекі павінны прызначацца па паказаннях (індывідуальны падыход); у дозе, якая адпавядае канкрэтнаму пацыенту; з індывідуальнай працягласцю прымянення і ўлікам фінансавага складніка (даступнасці як для медарганізацый, так і для пацыента).

■ Псіхалогія для ўсіх

ЯК ВАВЁРКА Ў КОЛЕ

ШТО РАБІЦЬ, КАБ НЕ ПАДАРВАЦЬ ПСІХІКУ?

Наша псіхічнае здароўе ці нездароўе — родам з дзяцінства. Наогул кожны перыяд развіцця чалавека мае свае крытычныя кропкі, калі рызыка развіцця захворвання псіхікі істотна павышаецца. Аднак ці з'явіцца такая паталогія ў канкрэтнага чалавека, залежыць ад трох «кітоў» — спадчыннасці, асяроддзя, у якім даводзіцца жыць, і наяўнасці іншых праблем са здароўем.
Бывае, што этапы праходзяць не зусім нармальна, і тады фарміруецца псіхічная паталогія. Яна можа быць рознай цяжкасці. Ёсць выпадкі, калі чалавек страчвае сувязь з рэальнасцю, у яго адсутнічае крытычнасць, развіваюцца трызненне і галюцынацыі. Чалавек у псіхозе лічыць, што са светам штосьці не тое. Трэба адрозніваць пры гэтым чалавека «ў неўрозе» — кантакт з рэальнасцю не страчаны, ёсць крытычнае стаўленне да свайго стану, разуменне таго, што праблема звязана з самім сабой. Разрыў з рэальнасцю, або псіхатычнае расстройства, — гэта, напрыклад, шызафрэнія, цяжкая дэпрэсія, а неўратычнае — гэта трывожныя расстройствы, некаторыя віды дэпрэсіі і інш.

— Кожны перыяд развіцця ставіць задачы, з якімі чалавек павінен справіцца і набыць пэўны жыццёвы вопыт і рысы характару, — тлумачыць **загадчыца аддзялення Мінскага гарадскога клінічнага псіхіятрычнага дыспансера Алена КОЯН.** — Да 3 гадоў дзіця вучыцца давяраць дарослым, захоўваць вобраз блізкіх у сваёй памяці, калі іх няма побач. З 3 да 6 гадоў узрастае самастойнасць, дзіця атаясамлівае сябе і іншых з жаночым і мужчынскім полам. З 6 да 13 гадоў — час сацыялізацыі, калі вялікую ролю іграюць равеснікі. З 14 да 19 вельмі складаны перыяд фізічнага, псіхалагічнага і палавога выспявання, спроба быць самастойным, незалежным і ў той жа час неабходнасць усвядоміць сваю залежнасць ад бацькоў. Важным этапам развіцця з'яўляецца фарміраванне псіхалагічнай спеласці, але гэта ўжо не залежыць ад узросту...

Гэта прагучыць банальна, але **для гарманічнага развіцця важна, у якой абстаноўцы мы раслі.** Любая стадыя пройдзе нармальна, калі бацькі любяць, разумеюць і прымаюць. І не заўсёды важнай умовай з'яўляецца наяўнасць поўнай сям'і. Бо там, дзе адзін ці абое бацькоў злоўжываюць алкаголем, або ёсць сямейны тыран, або адзін з бацькоў — надта строгі, халодны, чэрствы, гарманічнае развіццё будзе немагчымым нават пры наяўнасці абаіх бацькоў.

Быць бацькамі — задача не з лёгкіх. Трэба шмат працаваць над сабой, сумесна перажываць усе дзіцячыя перажыванні, няўдачы і дасягненні. Дзіця неабходна многаму навучыць, але пры гэтым не забываць, што яно — не наша ўласнасць. Гэта асоба, з якой мусяць лічыцца!

У кожнага з нас ёсць свой набор стрэсавых фактараў. І тое, што для аднаго чалавека будзе траўмай, для другога такой не з'яўляецца. Як мы перажываем напружаныя моманты — таксама важна для нашай псіхікі.

Сучаснае жыццё ў вялікім горадзе з'яўляецца пастаяннай крыніцай дыскамфорту. Колькасць інфармацыі, якая на нас звальваецца, паток людзей, машын, патрабаванняў на працы, ва ўніверсітэце, школе, заахвочванне працагалізму... Усё гэта патрабуе пастаяннага засяроджвання, напружання і самааддачы. Але ці ёсць у нашага арганізма рэсурс для гэтага? Колькі ён можа вытрымаць? У многім гэта залежыць ад асобы і здольнасці спраўляцца з напружаннем. Дарэчы, **калі дарослыя ў свой час пастаянна засцерагалі нас ад жыццёвых цяжкасцяў, тым самым яны пазбавілі нас магчымасці вучыцца пераадольваць праблемы і набываць новы вопыт.** Мы не ўмеем адпачываць і не вучым гэтаму дзяцей. Мы часта ганяемся за дасягненнямі і забываем пры гэтым пра свае сапраўдныя жаданні. А гэта — прамы шлях да развіцця таго ж неўрозу.

З ЧАГО ПАЧНЁМ?

1. Вучыцца і яшчэ раз вучыцца размаўляць з іншымі і дамаўляцца! І не толькі са сваякамі.

2. Пасля завяршэння працоўнага дня зачыніце дзверы і пакіньце думкі пра работу за гэтымі дзвярыма. Не пакідайце галаву на працы. Дома трэба пабыць з блізкімі — яны дадуць тую энергію, якая пасля спатрэбіцца для новых працоўных подзвігаў.

3. Важна не толькі адпачываць фізічна, але і атрымліваць новыя ўражанні (асабліва работнікам разумовай дзейнасці). Не лянуйцеся! Плануйце выхадныя і адпачынак так, каб назапасіць уражанні і эмоцыі.

4. Калі не можаце жыць адно з адным, калі ваша сям'я — поле бітвы з пастаяннымі сваркамі, навошта вы працягваеце траўмаваць адно аднаго? Адкажыце на гэта пытанне.

5. Не жывіце ў атмасферы гвалту і прыніжэння. Толькі вы выбіраеце або не выбіраеце, дзе вам жыць і з кім.

6. Ваша фізічнае здароўе непасрэдна звязана з псіхічным. Фізічная нагрузка карысная для арганізма.

7. Нельга ўвесь час эксплуатаваць цела, нібы яно вечны рухавік і не зношваецца.

8. Перажываць душэўны боль — нармальна. Не нармальна, калі жыццё складаецца толькі з душэўнага болю.

9. **Калі вы не можаце дапамагчы сабе, адчуваеце сябе ў пастцы, жывяце ў пастаянным напружанні, то наспеў час ісці да псіхатэрапеўта.** Гэта добры спецыяліст у галіне псіхічнага здароўя, і ён ёсць амаль у кожнай паліклініцы. Калі няма ў вашай, пашукайце ў суседняй.

■ Антыстрэс

ВЯРТАННЕ ДА СЯБЕ

Знімаем стрэс і вяртаем спакой з дапамогай няхітрых рэкамендацый Тыбета

Паводле тыбецкай медыцыны, свет складаецца з трох відаў энергіі. Адзін з іх называецца «энергіяй ветру». Дысбаланс гэтай энергіі прыводзіць да стрэсу. Недасыпанне, хваляванне, трывога, лішак відэапраглядаў, праслухоўванне музыкі, шмат кантактаў з іншымі людзьмі — усё гэта ўзмацняе энергію «ветру» і парушае нашу душэўную, эмацыянальную раўнавагу. Спецыялісты тыбецкай медыцыны ведаюць, што дапамагае сцішыць «вецер» і супакоіцца.

Дабаўце спецый

Напрыклад, мускатны арэх. Ён мае цёплую прыроду, а таму гэта спецыя-антыстрэс нумар адзін. Яе, як і карыцу, часта прапануюць у кавярнях, аднак дабаўляць мускатны арэх можна не толькі ў каву. Ён цудоўна спалучаецца з рознымі відамі чаю, дэсертамі, асноўнымі стравамі. Калі вы «ў стрэсе», падсыпце мускатны арэх у любыя стравы, і кожная з іх такім чынам стане лекавай. Важна, каб гэта было не больш за 1 чайную лыжку на дзень.

Кмен, або зіра, і «зазямліцца» дапамагае, і паляпшае страваванне. Можна піць кменную гарбату. Палову чайнай лыжкі кмену трэба заліць шклянкай кіпеню і даць настояцца некалькі хвілін. Лёгкасць пасля яды забяспечана. А кардамон не толькі балансуе «вецер», але і знімае ацёкі, нармалізуе работу нырак.

Зрабіце масаж

Перад сном па стрэлцы гадзінніка ўцірайце топленае сметанковае масла або кунжутны ці аліўкавы алей. Уціраць трэба ў цэнтр далоняў ці ступняў. Рабіце самамасаж кожны раз пасля напружанага дня, калі вас нешта моцна ўзрушыла. Гэта дапаможа заснуць і спаць глыбока.

Медытуйце тры хвіліны

Гэтае практыкаванне можна выконваць дзе і калі заўгодна. Сядзьце зручна, заплюшчыце вочы, засяродзьце ўвагу на дыханні. Адчуйце халаднаватае паветра, якое ўдыхаеце, і цеплыню паветра, якое выдыхаеце. Паступова ваша дыханне стане больш павольным і глыбокім. Калі круцяцца нейкія думкі, адпусціце іх, і яны знікнуць. Вы павінны засяродзіцца выключна на дыханні. Такое пераключэнне ўвагі пазбаўляе мітусні, вяртае нас да сябе.

Піце зёлкі і не толькі

Высокая колькасць танінаў у моцным зялёным чаі павялічвае «вецер» нават мацней за чорны чай і каву. Таму гэтыя напоі трэба чаргаваць з рамонкавым чаем, цёплым малаком з мёдам і карыцай, цёплай вадой, сокамі з мякаццю (апельсінавым, маркоўным, вінаградным). Што датычыцца алкаголю, то аддаваць перавагу трэба ў гэтым выпадку не піву, а моцнаму алкаголю або гарачаму віну са спецыямі (у невялікай колькасці, вядома).

«Уцяпліце» меню

Антыстрэсавая ежа павінна быць цёплай і масляністай. Сухое і халоднае супрацьпаказана. Сыраядзенне, галаданне, вегетарыянства з нізкай колькасцю бялку (бабоў, арэхаў) таксама павялічваюць «вецер». Нават садавіну лепей ужываць гатаванай: яблыкі і грушы можна запякаць, а бананы смажыць ■

Матэрыялы падрыхтавала Святлана БАРЫСЕНКА.
protas@zviazda.by

■ Святло ў акне

ТЭЛЕФОН ДЗІЦЯЧАГА ДАВЕРУ,

або «Кантэйнер» для збору афекту і стабілізацыі эмоцый

Маці на прыпынку шлёпае дзіця. Двое падлеткаў б'юцца ля школы. Бабуля на ўсю вуліцу папракае ўнука за нязграбнасць... Гэтыя ледзьве не штодзённыя бытавыя замалёўкі выклікаюць у нас смутак ці абурэнне, аднак расцэньваюцца большасцю як звычайная з'ява, а абразы, пагрозы, фізічнае пакаранне даўно сталі часткай выхавання... Рэдка хто задумваецца, што такія праявы не норма, а гвалт. Нават калі блізкія без усялякай агрэсіі проста ігнаруюць малога або наадварот, празмерна клапоцяцца пра яго і, жадаючы абараніць ад усіх непрыемнасцяў, уцякаюць маленькага чалавека ў шчыльныя рамкі, — гэта таксама гвалт, бо абмяжоўвае патрэбы дзіцяці.

Калі вырашыць набалелыя праблемы самастойна не атрымліваецца, стог перажыванняў і хвалюючых пытанняў расце, а падзяліцца страхамі няма з кім, адно з найлепшых выйсцяў — дзіцячы тэлефон даверу. Так, усё правільна. Тэлефон хоць і дзіцячы, але карыстацца ім можна і дарослым, бо менавіта яны, разабраўшыся ў сабе, могуць дапамагчы і малым.

ЗВАНКІ З ДАХУ

Карэспандэнт «Звязды» сустрэлася з Таццянай, адным з кансультантаў-псіхолагаў, якія, знаходзячыся на тым баку праводу, выслухаюць, параяць і дапамогуць не перайсці мяжу, пасля якой не будзе шляху назад. Каб зразумець суразмоўцу і выратаваць ад праблем, мала прафесійных ведаў і агульнай эрудзіраванасці. Кансультанты павінны ўмець не толькі слухаць, але і задаваць правільныя пытанні, сістэматызаваць атрыманую інфармацыю і мець каласальную вытрымку. У багажы кожнага з іх — багаты прафесійны вопыт.

Усе званкі ананімныя і не рэгламентаваны па часе. Яны могуць працягвацца ад некалькіх хвілін да пары гадзін. Апошняе здараецца, калі тэлефануюць людзі з суіцыдальнымі намерамі.

— *Такія званкі патрабуюць ад аператара каласальнай энергіі, вялікага напружання і пільнасці. Чалавека трэба выцягнуць са стану гатоўнасці скончыць жыццё, стабілізаваць, стварыць для яго нейкую перспектыву, каб упэўніцца, што яго намеры змяніліся,* — падзялілася кансультант. — *Чалавек, які звоніць, стоячы на даху, хоча, каб яго выратавалі. Мы стараемся зачапіцца за тыя стрункі душы, што дазволяць пакінуць яго на зямлі. Перш за ўсё дамаўляемся, каб ён спусціўся з даху, а далей пытаемся, слухаем, раім...*

На шчасце, скаргі на сексуальны і фізічны гвалт не надта частыя. Самая распаўсюджаная праблема, з якой на тэлефон даверу звяртаюцца і падлеткі, і дарослыя, — узаемаадносіны «бацькі—дзеці» і з аднагодкамі. Людзі хочуць атрымаць падказку, як паводзіць сябе ў пэўных выпадках, каб пазбегнуць канфліктаў.

Усе званкі ананімныя і не рэгламентаваныя па часе. Яны могуць працягвацца ад некалькіх хвілін да пары гадзін. Апошняе здараецца, калі тэлефануюць людзі з суіцыдальнымі намерамі.

— *Пару гадоў таму нумар дзіцячага тэлефона даверу змяніўся. Гэта нанесла вялікі ўрон нашай справе. Спатрэбіцца доўгі час, каб людзі прызвычаіліся, і новы нумар зноў стаў папулярным,* — перажывае Таццяна. — *Цяпер на яго, дарэчы, больш звоняць менавіта дарослыя, якіх хвалююць непаслухмянасць дзяцей, непавага, рэакцыі пратэсту, уласцівыя падлеткаваму ўзросту. Аднак хто б ні званіў, усе хочуць навучыцца ўздзейнічаць на іншага, а не выпраўляць сябе.*

ПСІХОЛАГ, ПЕДЫЯТР І ВЫХАВАЛЬНІК

Часта кансультантам службы даверу даводзіцца выступаць у ролі... педыятра, бо шмат пытанняў адрасуюць маладыя мамы, якія, па словах спецыялістаў, часта аказваюцца не гатовымі да мацярынства. Яны дрэнна ўсведамляюць, як паводзіць сябе падчас цяжарнасці, як клапаціцца пра немаўля, мала ведаюць пра асаблівасці развіцця ў кожным узросце.

— *Нізкі ўзровень бацькоўскай кампетэнтнасці робіць актуальным пытанне стварэння ў краіне псіхаадукацыйных праграм для бацькоў,* — робіць выснову, зыходзячы з гутарак з бацькамі, кансультант дзіцячага тэлефона даверу. — *Выхоўваючы адпаведныя веды ў бацькоў, мы, магчыма, зможам зменшыць уседазволенасць і эгацэнтрычнасць, якая праяўляецца сёння ў многіх дзяцей, якія бяруць прыклад з дарослых. З іншага боку, некаторыя бацькі ствараюць для сябе нейкі ідэал, да якога дзіця павінна імкнуцца. Калі ж чаканні не адпавядаюць рэчаіснасці, а ідэальны вобраз не супадае з рэальным, наступае расчараванне. Пачынаюцца прэтэнзіі, прыдзіркі, якія пераходзяць у завышаныя патрабаванні да дзіцяці.*

Адна з самых асноўных прычын сучасных непаразуменняў паміж бацькамі і дзецьмі — выхаванне «мімаходам», упэўнена спецыяліст. Між тым вырашыць праблему непаслухмянасці малых досыць проста. Не трэба крычаць з кухні «Садзіся рабіць урокі!» або «Прыбяры пакой, збяры цацкі!» — на інструкцыі з іншага пакоя дзіця не адрэагуе і працягне займацца сваімі справамі. Каб просьбы дарослых былі дзейснымі, трэба наладзіць з сынам ці дачкой візуальны кантакт.

— *Калі дзіця пачула і зразумела вашу просьбу, але не спяшаецца яе выконваць, застаньцеся «стаяць над душою» гэткім маўклівым назіральнікам-сведкам, каб малы не страціў матывацыю зрабіць даручанае,* — раіць Таццяна. — *Такім чынам мы прывіваем дзецям устойлівую звычку на ўзроўні ўмоўнага рэфлексу, што бацькоўскія просьбы — гэта данасць, якую трэба выконваць.*

ДАЗВОЛЬЦЕ ВАМ ДАПАМАГЧЫ

— *Часта людзі тэлефануюць, каб проста падзякаваць за дапамогу. Магчыма, яны адчуваюць патрэбу ў зваротнай сувязі. Памятаю, маладая жанчына пыталася, як прывучыць дзіця засынаць без святла і мамы. Я па кроках раіла ёй, што рабіць. І праз некалькі месяцаў яна расказала, што рэкамендацыі спрацавалі,* — адзначае Таццяна. — *Мы пэўным чынам з'яўляемся «кантэйнерам», у які той, хто звоніць, можа змясціць свае перажыванні і стан афекту. Мы і кансультацыйную дапамогу аказваем, і спачуваем, і стабілізуем эмацыйны стан, і распрацоўваем пэўны план дзеянняў. Па сутнасці, просім чалавека дазволіць яму дапамагчы.*

Дзецям кансультанты расказваюць, як абараніць сябе ад гвалту, куды накіравацца па дапамогу, дзе атрымаць падтрымку. Вучаць смела казаць дарослым, што нейкія рэчы ім непрыемныя ці балючыя. Здараецца, што адзін з бацькоў зневажае і крыўдзіць малога, а другі нават не здагадваецца пра гэта. Тады спецыяліст прапануе пазваніць блізкім дзіцяці, каб далучыць іх да працэсу перамоў, каб не толькі дзіця апелявала да бацькоў, але і аператары звярнуліся да іх.

— *Калі ў праблемных адносінах з'яўляецца трэці бок, гэта заўсёды дзейсна. Часам, малыя потым тэлефануюць ужо разам з бацькамі, якія становяцца больш пільнымі, калі даведваюцца, што да іх сямейных праблем далучыўся нехта незнаёмы,* — працягвае спецыяліст. — *Мы гаворым сваякам, што з'яўляецца гвалтам, а калі чуем, што здзекі маюць празмерныя формы, інфармуем бацькоў, што яны могуць пазбавіцца сваіх правоў. Тым не менш, умяшацца ў сітуацыю і звярнуцца да сямейнікаў мы можам толькі з дазволу таго, хто звоніць. Як правіла, дзеці рэагуюць адэкватна, разумеючы, што атрымаюць дапамогу, бо «цётка пагаворыць з бацькамі».*

Дзіцячы тэлефон даверу — (8017) 2460303.

Здараюцца сітуацыі, калі патрабуецца самае непасрэднае і тэрміновае ўмяшанне.

— *Аднойчы нам пазваніла дзяўчынка-падлетак, якая стамілася быць маці для свайго малодшага брата. Яна вадзіла яго ў садок, карміла, даглядала, бо іх непрацуючая маці спускала ўсе грошы на наркотыкі, а на дзяцей забылася,* — расказала спецыяліст. — *Са згоды дзяўчынкі мы забралі іх ад біялагічнай маці, якую потым пазбавілі бацькоўскіх правоў, а дзеці накіраваліся на сямейную форму ўладкавання.*

Калі кансультант разумее, што існуе непасрэдная пагроза для жыцця, то праз інспекцыю па справах непаўналетніх ініцыюе праверку па званку:

— *Быў выпадак, калі жанчына расказала па сітуацыю з суседзямі. Адзінокая маці пакідала па начах малое адно дома. Дзіця ўвесь час плакала. Мы ў той жа дзень накіравалі туды інспекцыю. Больш нам тая жанчына не званіла, так што, думаю, справа вырашылася.*

Ірына СІДАРОК

■ Бяспека

ПАД'ЕЗД З «ВАЧАМІ»

Усе здзейсненыя на Гомельшчыне летась забойствы — іх было 61 — раскрыты, паведаміў на прэс-канферэнцыі намеснік начальніка міліцыі грамадскай бяспекі УУС аблвыканкама Анатоль ВАСІЛЬЕЎ.

Дарэчы, большасць з іх здараецца на бытавой глебе, 9 з 10 — у стане алкагольнага ап'янення. Летась праваахоўнікі правялі і актыўную працу па завяршэнні расследаванняў правапарушэнняў мінулых гадоў. У выніку 67 даўніх цяжкіх злачынстваў раскрыта. Напрыклад, гомельскія аператыўнікі цяпер змаглі знайсці злачынцу, які ў 1994 годзе напаў на таксіста-прыватніка.

Праваахоўныя органы зафіксавалі дастаткова «крэатыўныя» правапарушэнні. Ужо сёлета ў госці да жыхара Светлагорска прыехала 54-гадовая грамадзянка Украіны. Яна звярнулася ў міліцыю з заявай пра тое, што ў яе выкралі сумачку разам з пашпартам. Аднак падчас расследавання стала зразумела, што крадзяжу ўвогуле не было, а заява патрэбна была для таго, каб паскорыць працэс абмену пратэрмінаванага пашпарта ў сябе на радзіме. Цяпер грамадзянцы, верагодна, прыйдзецца значна затрымацца ў Беларусі. Яе дзеянні Крымінальны кодэкс трактуе як загадзя лжывы данос.

Намеснік начальніка міліцыі грамадскай бяспекі асаблівую ўвагу звярнуў на папераджальную работу са старымі людзьмі, якія занадта часта становяцца ахвярамі ашуканцаў. Пад выглядам супрацоўнікаў медыцынскіх, сацыяльных, камунальных службаў апошнія пранікаюць у жыллё і крадуць зберажэнні старых.

І яшчэ адна ініцыятыва праваахоўнікаў вартая ўвагі. Актыўнае ўкараненне інфармацыйных і тэлекамунікацыйных тэхналогій спрыяе скарачэнню вулічнай злачыннасці. Летась іх стала менш на 5%. Пры гэтым павялічыўся ўзровень раскрывальнасці. А ўсё таму, што ўжо шмат дзе ўсталяваныя камеры відэаназірання. Анатоль Васільеў падкрэсліў, што далей, пасля паспяхова завершанай праграмы «Зачынены пад'езд», трэба праводзіць акцыю па масавым усталяванні відэакамер каля пад'ездаў шматпавярховікаў. Як апошні станоўчы прыклад — у тым ліку з дапамогай інфармацыі з камер відэаназірання — у канцы мінулага года міліцыянеры затрымалі ў Гомелі мужчыну, які ўчыніў шэраг гвалтоўных дзеянняў у дачыненні да дзевяці жанчын.

Ірына АСТАШКЕВІЧ.
iost@zviazda.by

■ Немагчымае магчыма

ІХ АБ'ЯДНАЎ НЯПРОСТЫ ЛЁС

Як маладыя людзі з фізічнымі абмежаваннямі ўплываюць на сваіх равеснікаў, якія парушылі закон

Неймаверна цяжка маці, калі дзіця нараджаецца з асаблівасцямі развіцця. Але яшчэ цяжэй жанчыне, калі малое становіцца інвалідам у выніку абставін, якія немагчыма растлумачыць. Насця Мірановіч з Крупскага раёна з'явілася на свет моцнай, здаровай. Ды ў тры гады нечакана захварэла. Хвароба паўплывала на зрок — у сем гадоў дзяўчынка аслепла. Цяпер яна вучыцца ў 10 класе, і толькі на «выдатна». Куды будзе паступаць — пакуль не вырашыла. Але ў тым, што атрымае вышэйшую адукацыю, упэўнена.

— Мы разам з маёй дачушкай крочым па жыцці, — распавяла яе мама Галіна Уладзіміраўна. — Спрабавалі з Насцяй наведваць розныя мерапрыемствы. Але аднойчы вярнуліся расчараваныя. Уявіце, навагодняе свята, ёлка. Дзед Мароз гуляе з малымі, рассыпае розныя цацкі. Хлопчыкі і дзяўчынкі наперабой збіраюць іх. Наста таксама спрабуе падняць, ды ў яе ўсё падае з рук. Здаровыя дзеці гэтага не разумеюць, бегаюць, штурхаюцца. Было балюча і мне, і дачцэ. І мы больш нікуды не хадзілі.

Але Насця ніколі не сядзела склаўшы рукі: вучылася іграць на гітары, вышывала бісерам, пляла макрамэ. У выніку дома назапасілася шмат работ. Юная майстрыха вырашыла паўдзельнічаць у выставе, што ладзілася ў мясцовым Доме культуры. Ды яе творы не заўважылі журы. Знаёмая параіла Галіне Уладзіміраўне звярнуцца ў Крупскі тэрытарыяльны цэнтр сацыяльнага абслугоўвання насельніцтва, дзе працуе аддзяленне дзённага знаходжання для маладых інвалідаў. Жанчына звязалася з яго загадчыцай Людмілай Гур, якая прыняла Насцю ў групу.

Аднойчы прывезлі да іх Насціны вырабы з бісеру. Выхаванцы папраўчай установы былі ўражаны выставай і ніяк не хацелі паверыць, што гэтыя творы — справа рук сляпой дзяўчынкі, пакуль не пабачылі Насцю.

— Я дарослая, але адпачываю тут душой, бачу аддачу, тое, як раскрылася мая дачушка, — кажа Галіна Мірановіч. — Тут працуюць цудоўныя спецыялісты, прафесіяналы сваёй справы, якія любяць кожнага выхаванца.

— Наша аддзяленне наведваюць 20 чалавек ва ўзросце ад 18 да 31 года. Усе яны вельмі таленавітыя, актыўна ўдзельнічаюць у праектах, якія ладзім сумесна з грамадскімі аб'яднаннямі, раённай арганізацыяй таварыства Чырвонага Крыжа. Адзін з іх — «У будучыню — з надзеяй і верай», — расказалі спецыялісты аддзялення. — Справа ў тым, што ў раёне знаходзіцца папраўчая ўстанова адкрытага тыпу, у якой адбываюць пакаранне ў тым ліку і маладыя людзі. Хтосьці з іх паспрабаваў «спайсы», нехта захацеў узяць тое, што яму не належыць, іншы сеў за руль аўтамабіля нецвярозым. Гэтыя дзеянні не кваліфікуюцца, як цяжкія. Але ўсё ж гэта злачынствы. І штуршком да іх у кожнага стала свая прычына: спакусы, нежаданне пераадольваць цяжкасці, імкненне хутка разбагацець. Псіхолагі сцвярджаюць, што віной усяму адсутнасць надзейнага «ўнутранага стрыжня», на якім трымаецца паўнавартасная, сацыяльна сталая асоба. Але ў многіх выпадках ўсё гэта можна папраўіць рознымі метадамі, адзін з іх — прыклад людзей, якія сутыкнуліся ў жыцці з сапраўднымі цяжкасцямі, але змаглі правільна расставіць акцэнты і развіць у сабе лепшыя якасці.

Сапраўды, у маладых людзей з інваліднасцю і асуджаных няпросты лёс. Для адных сур'ёзным выпрабаваннем сталі хваробы, другія спатыкнуліся ў жыцці і адбываюць пакаранне. Але праблемы ў іх агульныя, перш за ўсё стэрэатыпы, якія перашкаджаюць сацыяльнай інтэграцыі. Пераадолець іх разам, узбагаціцца зносінамі, даведацца пра гэты свет больш і адчуць яго глыбей — на гэта скіраваны праект.

У межах яго маладыя інваліды наведваюць сваіх равеснікаў на «хіміі». Аднойчы прывезлі Насціны вырабы з бісеру. Але яна сама не змагла прыехаць. Выхаванцы папраўчай установы былі ўражаны выставай і ніяк не хацелі паверыць, што гэтыя творы — справа рук сляпой дзяўчынкі, пакуль не пабачылі Насцю. У той дзень у яе быў Дзень нараджэння, яна для іх іграла на гітары, чытала вершы. Хлопцы былі пад вялікім уражаннем ад таго, што гэтая прыгожая і бездапаможная дзяўчынка мае сілу волі, можа так паўнавартасна жыць. «Хімікі» падаравалі ёй букет руж, цукеркі і мяккую цацку — вялікую руковую зайчыху, якую яна назвала Мальвінай.

Насця падзякавала ім і сказала, што калі б у яе было паўнацэннае здароўе, то яна зрабіла б яшчэ больш. Самае галоўнае — верыць у лепшае, у тое, што ўсё задуманае здзейсніцца, прывяла асабісты прыклад. Справа ў тым, што Насця заўжды марыла трапіць на тэлебачанне. І яе жаданне збылося, дзяўчынку паказалі на тэлеканале СТБ.

А Галіна Уладзіміраўна дадала: «Вы не ведаеце, што робіцца ў душы маці, калі ў яе дзіцяці маюцца фізічныя абмежаванні. Колькі трэба любові, вытрымкі, каб навучыць яго з гэтым жыць. Вам Бог даў усё: ногі, рукі, зрок, розум, і вы павінны радаваць сваіх маці».

— Мой сын Косця інвалід трэцяй групы, — падзялілася сваім болем іншая жанчына, Наталля Яўгенаўна. — Раней ён цэлымі днямі ляжаў дома, адвярнуўшыся да сцяны. І я таксама адчувала сябе няшчаснай, гледзячы на яго пакуты. Калі сын пачаў наведваць аддзяленне дзённага знаходжання, то непазнавальна змяніўся, а разам з ім перамянілася і я. Менавіта тут маё дзіця атрымала душэўную цеплыню, узаемаразуменне, падтрымку, знайшло сяброў.

Косця захапляецца гістарычнымі кнігамі, займаецца гістарычнай рэканструкцыяй, сваімі рукамі майструе зброю Сярэдневякоўя. Хлопец марыць выступіць з тэматычным паведамленнем перад сябрамі, выхаванцамі папраўчай установы. Яму, праўда, цяжкавата вымаўляць доўгія фразы, маналогі, але прагрэс адчувальны ў параўнанні з тым, што было раней. Работнікі аддзялення змаглі яго разгаварыць, адагрэць, ён пайшоў на кантакт, яго душа раскрылася перад людзьмі.

У знак удзячнасці маці Косці запісалася ў аддзяленне валанцёрам, вучыць дзяцей вышываць, вязаць пруткамі і шыдэлкам.

Таццяна ЛАЗОЎСКАЯ. *lazovskaya@zviazda.by*

■ Чыйсьці шанц

ДАРОГА Ў НЕБА

Авіякампанія «Белавія» аб'явіла аб дадатковым наборы бортправаднікоў на конкурснай аснове.

Паводле слоў начальніка аддзела рэкламы і камунікацый авіякампаніі Вольгі Герасенка, плануецца набраць не менш за 15 новых супрацоўнікаў, якія павінны ўліцца ў цяперашні штат з 320 бортправаднікоў. Патрэба ў дадатковых кадрах абумоўлена пашырэннем сеткі маршрутаў, павелічэннем колькасці рэйсаў.

Авіякампанія прад'яўляе наступныя патрабаванні да кандыдатаў. Узрост ад 18 гадоў, рост для жанчыны 165—170 сантыметраў, для мужчын — 170—180. Адукацыя павінна быць не ніжэй за поўную сярэднюю, а валоданне англійскай мовай на ўзроўні, не ніжэйшым за intermediate. Кандыдатамі не могуць быць студэнты вочнай формы навучання. Для ўдзелу ў конкурсе ахвотныя павінны прайсці ўрачэбную лётна-экспертную камісію.

Сяргей РАСОЛЬКА. *rs@zviazda.by*

Центр Промышленной Оценки
• Организация аукционов
• Оценка всех видов имущества

ИЗВЕЩЕНИЕ О ПРОВЕДЕНИИ ПОВТОРНОГО АУКЦИОНА

Организатор аукциона	ЗАО «Центр промышленной оценки», г. Минск, ул. Мележа, 5/2, пом. 1703
Продавец	ОАО «МПОВТ», г. Минск, ул. Притыцкого, 62
Предмет аукциона (объекты недвижимости, расположенные по адресу: г. Минск, ул. Притыцкого, д. 62)	

Лот № 1:

Наименование	Назначение	Общая площадь, м²	Инвентарный номер
Административно-бытовой корпус (Литер Ж 4/к)	Здание административно-хозяйственное	613,3	500/С-31573

Начальная цена с НДС 20% – 3 711 052 800 белорусских рублей

Лот № 2:

Здание административно-бытового корпуса № 2 (Литер Г 4/к)	Здание административно-хозяйственное	799	500/С-31575

Начальная цена с НДС 20% – 4 864 809 600 белорусских рублей

Лот № 3:

Финский модуль № 1	Здание специализированное иного назначения	873	500/С-31574

Начальная цена с НДС 20% – 3 711 052 800 белорусских рублей

Начальные цены снижены на 30%. Лоты частично сданы в аренду. Более подробную информацию по арендаторам можно узнать у организатора аукциона

Сведения о земельном участке: Площадь: 0,4555 га, из них 0,1547 га с ограничениями в использовании земель – охранная зона сетей и сооружений канализации, охранная зона сетей и сооружений теплоснабжения, охранная зона сетей и сооружений газоснабжения. Целевое назначение: Земельный участок для эксплуатации и обслуживания зданий административно-хозяйственных и зданий специализированных иного назначения. Земельный участок предоставлен продавцу на праве аренды сроком по 31 августа 2053 года. Земельный участок является неделимым и будет предоставлен покупателям в общую долевую аренду

Задаток 5% от начальной цены лота в белорусских рублях (BYR) перечисляется на р/с № 3012343260010; нерезидентами РБ может перечисляться в валютном эквиваленте по курсу Нацбанка РБ на дату платежа на в/с: в долларах США (USD) – 3012343265044; в российских рублях (RUB) – 3012343265028; в Дирекции ОАО «Белинвестбанк» по г. Минску и Минской области, БИК 153001739, УНП 191021390, получатель платежа – ЗАО «Центр промышленной оценки»

Срок подписания договора купли-продажи	15 рабочих дней после проведения аукциона

Условия оплаты предмета аукциона

Если между продавцом и покупателем (победитель аукциона либо единственный участник аукциона, согласившийся приобрести предмет аукциона по начальной цене, увеличенной на 5%) в течение срока, установленного для подписания договора купли-продажи, не достигнуто договоренность по срокам и о порядке оплаты за предмет аукциона (Лот), такая оплата должна быть произведена в течение **30 (тридцати) календарных дней** после подписания договора купли-продажи

Предыдущие извещения о проведении аукциона опубликованы в газете «Звязда» 02.12.2015; 29.10.2015

Порядок проведения аукциона, оформления участия в аукционе, определения лица, выигравшего аукцион, а также возмещения затрат за организацию аукциона, оговорен в Условиях его проведения, размещенных на сайте организатора торгов **www.cpo.by**

Дата и время проведения аукциона	02.02.2016 в 12.00 по адресу: г. Минск, ул. Мележа, д. 5/2, пом. 1703, ЗАО «Центр промышленной оценки»
Дата и время окончания приема документов	01.02.2016 до 17.00 по адресу: г. Минск, ул. Мележа, д. 5/2, пом. 1703, ЗАО «Центр промышленной оценки»
Контактная информация	Тел.: +375 17-280-36-37; +375 29-183-69-71. E-mail: auction@cpo.by

ПЕРЕГОВОРЫ ПО ВЫБОРУ ПОДРЯДНОЙ ОРГАНИЗАЦИИ

УП «Проектный институт Белгипрозем»

приглашает вас принять участие в переговорах по выбору подрядной организации для проведения текущего ремонта.

Предмет закупки — текущий ремонт производственных помещений (2-х кабинетов) общей площадью 68,5 кв.м, расположенных на 7 и 8 этажах здания.

7 этаж — устройство покрытий полов из ламинированных панелей площадью 34,4 кв.м, очистка, шпатлевка, оклейка стен обоями — 56,4 кв.м, очистка, шпатлевка и окрашивание потолка — 34,4 кв.м, замена светильников для люминесцентных ламп — 9 шт., замена дверного блока ДГ 21—13;

8 этаж — устройство покрытий полов из ламинированных панелей площадью 34,1 кв.м, очистка, шпатлевка, оклейка стен обоями — 61,2 кв.м, очистка, шпатлевка и окрашивание потолка — 34,1 кв.м, замена светильников для люминесцентных ламп — 9 шт, замена дверного блока ДГ 21—13.

Переговоры будут проведены со снижением цены предложения без предварительного квалификационного отбора.
Срок выполнения работ — февраль–апрель 2016 года.
Время проведения переговоров – 28 января 2016 года в 11.00.
Информация о переговорах и заявка на участие по тел.: 207-05-33, тел./факс 212-07-00.

УНП 100035563

Утерянное свидетельство ИП Медведкова Александра Анатольевича, УНП 192450399, **считать недействительным.**

Центр Промышленной Оценки
• Организация аукционов
• Оценка всех видов имущества

ИЗВЕЩЕНИЕ О ПРОВЕДЕНИИ ПОВТОРНОГО АУКЦИОНА

ЗАО «Центр промышленной оценки» (организатор аукциона) по поручению ОАО «Гроднорайагросервис» (продавец) проводит открытый аукцион по продаже одним лотом объектов недвижимого имущества, расположенных по адресу:

Гродненская обл., Гродненский р-н, Обуховский с/с, д. Котра, ул. Молодежная, 2, в составе:

Наименование	Инвентарный номер	Общая площадь
Площадка на 50 автомашин (проезд)	401/С-22130	общ. пл. покрытия 7485 кв.м
Открытая стоянка тракторов (проезд)	401/С-22131	общ. пл. покрытия 6919 кв.м
Подъездные пути (проезд)	401/С-22132	общ. пл. покрытия 5319 кв.м
СТО на 100 автомобилей	401/С-11650	1682,9 кв.м
Столярный цех	401/С-11656	1006,8 кв.м
Мастерские	401/С-11654	991,2 кв.м
Склад	401/С-11651	636,7 кв.м
Здание гостиницы	401/С-9639	661,3 кв.м
Здание административно-хозяйственное	401/С-11655	482,3 кв.м
Кафе-бар	401/С-9640	374,1 кв.м
Диспетчерская	401/С-11653	57,7 кв.м
Проходная	401/С-11652	131,3 кв.м
Автозаправочная	401/С-18230	12,5 кв.м
Трансформаторная подстанция	401/С-11657	40,6 кв.м
Сооружения благоустройства	401/С-22133	-
Канализационная сеть (ливневая)	401/С-22050	протяженность 183 м
Канализационная сеть (фекальная)	401/С-22049	протяженность 320,8 м
Тепловая сеть	401/С-22052	протяженность 58 м

в т.ч. оборудование: кран-балка 3 т, инв. № 5016; кран-балка подвесная, инв. № 1856; ТРК Квантум-500, инв. № 9990397; ТРК Квантум-500, инв. № 9990396, многолетние насаждения

В технические паспорта капитальных строений в качестве составных частей и принадлежностей внесены отдельные сооружения благоустройства, элементы инженерных сетей

Начальная цена с НДС 20% – 14 781 702 887 бел. руб. (снижена на 40%)

Земельный участок пл. 8,6869 га, предоставлен продавцу на праве постоянного пользования для эксплуатации и обслуживания зданий, с установленным ограничением – водоохранная зона водных объектов (пл. 7,8135 га)

Задаток 5% от начальной цены лота в белорусских рублях (BYR) перечисляется на р/с № 3012343260010; нерезидентами РБ в валютном эквиваленте по курсу Нацбанка РБ на дату платежа на в/с: в долларах США (USD) – 3012343265044; в российских рублях (RUB) – 3012343265028; в Дирекции ОАО «Белинвестбанк» по г. Минску и Минской области, БИК 153001739, УНП 191021390, получатель платежа – ЗАО «Центр промышленной оценки»

Договор купли-продажи должен быть подписан в течение **15** (пятнадцати) рабочих дней после проведения аукциона

Условия реализации объекта – вовлечение в хозяйственный оборот в течение трех лет с момента заключения договора купли-продажи

Условия оплаты: если между продавцом и покупателем в течение срока, установленного для подписания договора купли-продажи, не достигнута договоренность по срокам и порядку оплаты за объект, оплата стоимости имущества должна быть произведена в течение **30** (тридцати) календарных дней после проведения аукциона

Предыдущее извещение о проведении аукциона опубликовано в газете «Звязда» 04.12.2015

Порядок проведения аукциона, оформления участия в аукционе, определения лица, выигравшего аукцион, а также порядок оплаты вознаграждения и возмещения суммы фактических затрат за организацию и проведение аукциона оговорен в Условиях его проведения, размещенных на сайте организатора торгов **www.cpo.by**

Аукцион состоится **23.02.2016** в 14.00 по адресу: г. Гродно, ул. Понемуньская, 27, ОАО «Гроднорайагросервис»

Заявления на участие и необходимые документы принимаются по **19.02.2016** до 17.00 по адресу: г. Минск, ул. Мележа, д. 5/2, пом. 1703, ЗАО «Центр промышленной оценки»

Тел.: +375 17 280 36 37; +375 29 183 69 71.
E-mail: auction@cpo.by. Сайт: www.cpo.by

Утерянное страховое свидетельство обязательного страхования гражданской ответственности владельцев транспортных средств на территории Республики Беларусь (договор внутреннего страхования) серии ВА 5575445, страховые свидетельства по обязательному страхованию гражданской ответственности владельцев транспортных средств на территории государств – членов системы «Зеленая карта» серии BY/07/12293386, 12293387, страховой компании «Промтрансинвест» **считать недействительными.**

Центр Промышленной Оценки
• Организация аукционов
• Оценка всех видов имущества

ИЗВЕЩЕНИЕ О ПРОВЕДЕНИИ ПОВТОРНОГО АУКЦИОНА

ЗАО «Центр промышленной оценки» (организатор аукциона) по поручению ОАО «Витебский завод электроизмерительных приборов» (продавец) проводит повторный открытый аукцион по продаже объектов недвижимого имущества в составе:

Лот № 1:

Инвентарный номер	Наименование	Общая площадь	Адрес
200/С-50253	производственный корпус № 3 (в т.ч. кран-балка, инв. № 143798)	808,5 кв.м	г. Витебск, ул. 1-я Полярная, 3А/1

Начальная цена с НДС 20% – 2 192 303 390 бел. руб. (снижена на 40%)

Лот № 2:

Инвентарный номер	Наименование	Общая площадь	Адрес
200/С-43676	корпус № 7 (складской)	521 кв.м	г. Витебск, ул. 1-я Полярная, 3А/3

Начальная цена с НДС 20% – 417 600 000 бел. руб. (снижена на 40%)

Лот № 3:

База отдыха «Вышедки», расположенная по адресу: Витебская область, Городокский район, Стодолищенский с/с, 0,5 км южнее д. Вышедки, 1, в составе:

№ п/п	Инвентарный номер	Наименование	Общая площадь (кв.м)
1	201/С-10553	корпус № 1	52
2	201/С-10554	корпус № 2	51,3
3	201/С-10555	корпус № 3	51,7
4	201/С-10556	корпус № 4	51,2
5	201/С-10557	корпус № 5	50,9
6	201/С-10558	корпус № 6	52
7	201/С-10559	корпус № 7	75,3
8	201/С-12691	здание неустановленного назначения	23
9	201/С-12692	туалет	3,1

А также: воздушная линия электропередачи ВЛ-10 кВ, протяженность 945 м.п., инвентарный номер 201/С-12702, с трансформаторной подстанцией КТП; наружное освещение, инвентарный номер 201/С-12689

Начальная цена с НДС 20% – 523 295 760 бел. руб. (снижена на 35%)

Сведения о земельных участках: Лоты №№ 1–2 расположены на земельном участке пл. 3,1357 га, предоставленном в общую долевую аренду по 10.04.2065, для содержания и обслуживания производственных помещений.
Лот № 3 расположен на земельном участке площадью 1,9683 га, предоставленном продавцу на праве постоянного пользования для использования под базу отдыха. Земельный участок пл. 1,0141 га предоставлен продавцу на праве аренды по 28.07.2060, для содержания и обслуживания воздушной линии ВЛ-10; Земельный участок пл. 0,0293 га предоставлен продавцу на праве аренды по 28.07.2060, для содержания и обслуживания КТП-568. Земельные участки имеют ограничения в пользовании – водоохранная зона вне прибрежной полосы озера Вышедское

Задаток 10% от начальной цены в белорусских рублях перечисляется на р/с № 3012343260010; нерезидентами РБ задаток может перечисляться в валютном эквиваленте по курсу Нацбанка РБ на дату платежа на в/с: в долларах США (USD) – 3012343265044; в российских рублях (RUB) – 3012343265028; в Дирекции ОАО «Белинвестбанк» по г. Минску и Минской области, БИК 153001739, УНП 191021390, получатель платежа – ЗАО «Центр промышленной оценки»

Договор купли-продажи по Лотам №№ 1–2 должен быть подписан в течение **20** (двадцати) рабочих дней после согласования проекта договора купли-продажи с ОАО «БПС-Сбербанк», в связи с наличием обременения по Лотам №№ 1–2 в пользу ОАО «БПС-Сбербанк» (ипотека). Договор купли продажи по Лоту № 3 должен быть подписан в течение **20** (двадцати) рабочих дней после проведения аукциона. Оплата за объекты недвижимости производится в порядке, предусмотренном в договоре купли-продажи

Предыдущее извещение о проведении аукциона опубликовано в газете «Звязда» от 26.08.2015

Порядок проведения аукциона, оформления участия в аукционе, определения лица, выигравшего аукцион, а также порядок оплаты вознаграждения и фактических затрат на организацию и проведение аукциона оговорен в условиях его проведения, размещенных на сайте организатора торгов **www.cpo.by**

Аукцион состоится **25.02.2016** года в 14.00 по адресу: г. Витебск, ул. Ильинского, 19/18, корпус № 8, 3-й этаж, помещение 309, ОАО «ВЗЭП». Заявления на участие и необходимые документы принимаются по **23.02.2016** года до 17.00 по адресу: г. Минск, ул. Мележа, д. 5/2, пом. 1703, ЗАО «Центр промышленной оценки».

Тел.: +375 17 280 36 37; 8029 183 69 71. auction@cpo.by. www.cpo.by

БЕЛАРУЧСКИЙ СЕЛЬСКИЙ ИСПОЛНИТЕЛЬНЫЙ КОМИТЕТ

сообщает о проведении 19 февраля 2016 года открытого аукциона по продаже земельных участков в частную собственность для строительства и обслуживания одноквартирных жилых домов

Номер лота	Адрес земельного участка, кадастровый номер	Площадь, га	Инженерная и транспортная инфраструктура	Начальная цена, бел. руб.	Расходы по подготовке зем. документации	Сумма задатка, бел. руб.
1	Минская область, Логойский район, Беларучский сельсовет, д. Мерковичи, У-3, кадастровый номер земельного участка 623280405101000058	0,1450	Возможность подключения к коммуникациям	69 000 000	Публикация в газете + 13 255 152	6 900 000
2	Минская область, Логойский район, Беларучский сельсовет, д. Мерковичи, У-4, кадастровый номер земельного участка 623280405101000059	0,1450	Возможность подключения к коммуникациям	69 000 000	публикация в газете + 13 255 152	6 900 000

Задаток (10% от начальной цены) перечисляется на расчетный счет № 3600619011127 в ЦБУ № 611 филиала 500 — Минское управление ОАО «АСБ Беларусбанк», код 4901, получатель — Беларучский сельский исполнительный комитет.

Всем желающим предоставляется возможность ознакомиться с документацией и земельными участками, выставляемыми на аукцион.

Аукцион состоится **19 февраля 2016 года в 10.00** по адресу: Минская область, Логойский район, д. Алекшицы, ул. Центральная, д. 17. Заявления на участие принимаются по рабочим дням с 8.00 до13.00 и с 14.00 до 17.00 по адресу: Минская область, Логойский район, д. Алекшицы, ул. Центральная, д. 17.

Последний день приема заявлений – **15 февраля 2016 года до 17.00**.

Контактные телефоны: (801774) 58 4 36, 58 4 45.

РУП «Белпочта»

ОБЪЯВЛЯЕТ О ПРОВЕДЕНИИ ПЕРЕГОВОРОВ

ПО ВЫБОРУ ПОДРЯДНОЙ ОРГАНИЗАЦИИ ДЛЯ ВЫПОЛНЕНИЯ РЕМОНТНО-СТРОИТЕЛЬНЫХ РАБОТ НА ОБЪЕКТЕ

«Текущий ремонт пожарной сигнализации и оповещения о пожаре, охранной сигнализации в отделении почтовой связи №53 по адресу: Старовиленский тракт, 28/1 в г. Минске».

Процедура переговоров состоится «26» января 2016 года в 11.00 по адресу: г. Минск, пр. Независимости, 10.

Контакты для получения дополнительной информации: отдел капитального строительства РУП «Белпочта» – тел.: 293-55-29, 293-55-28. УНП 101015738

РУП «Белпочта»

ОБЪЯВЛЯЕТ О ПРОВЕДЕНИИ ПЕРЕГОВОРОВ

ПО ВЫБОРУ ПОДРЯДНОЙ ОРГАНИЗАЦИИ ДЛЯ ВЫПОЛНЕНИЯ РЕМОНТНО-СТРОИТЕЛЬНЫХ РАБОТ НА ОБЪЕКТЕ

«Текущий ремонт актового зала в здании Главного почтамта по пр. Независимости, 10 в г. Минске».

Процедура переговоров состоится «26» января 2016 года в 12.00 по адресу: г. Минск, пр. Независимости, 10.

Контакты для получения дополнительной информации: отдел капитального строительства РУП «Белпочта» – тел.: 293-55-29, 293-55-28. УНП 101015738

Уважаемые акционеры открытого акционерного общества «Дорожно-строительный трест №1, г. Витебск»

01 февраля 2016 года в 15.00 СОСТОИТСЯ ВНЕОЧЕРЕДНОЕ ОБЩЕЕ СОБРАНИЕ акционеров открытого акционерного общества

«Дорожно-строительный трест №1, г. Витебск»

Собрание пройдет по адресу Общества: г. Витебск, ул. Суворова, 16, актовый зал.

ПОВЕСТКА ДНЯ СОБРАНИЯ:

1. Об изменении размера уставного фонда Общества.
2. О принятии и утверждении решения о дополнительном выпуске акций Общества.
3. О внесении изменений в устав Общества.

С материалами, подготовленными к собранию, можно ознакомиться по адресу: г. Витебск, ул. Суворова, 16 (наблюдательный совет), с 21 по 29 января 2016 г. (время работы с 8.30 до 17.30), либо 01 февраля 2016 года по месту проведения собрания, тел. 37 45 66.

Регистрация участников собрания с 14.15 до 14.45 по месту проведения собрания.

Реестр владельцев ценных бумаг и список лиц, имеющих право на участие в общем собрании акционеров, будет составлен по состоянию на 21 января 2016 г.

Для регистрации при себе иметь следующие документы: акционеру общества – паспорт, представителю акционера – паспорт и доверенность.

Наблюдательный совет

УНП 300000398

ИЗВЕЩЕНИЕ О ПРОВЕДЕНИИ АУКЦИОНА ПО ПРОДАЖЕ ИМУЩЕСТВА ОАО «БПХО»

№ п/п	Наименование лота	Местонахождение	Начальная цена продажи, пониженная на 10%, с учетом НДС, руб.	Задаток 20%
1	**ЛОТ № 7 – капитальное строение: Дорога № 1 с инвентарным номером 110/С-110801 площадью 1437 кв.м**	Брестская область, г. Барановичи, ул. Фабричная 7/3, на земельном участке с кадастровым номером 141000000006002575 площадью 0,1437 га	836 406 509	167 281 301

Аукцион состоится 24 февраля 2016 в 14.00 по адресу: 225410, г. Барановичи, ул. Фабричная, 7, каб. 503, 5 этаж.

Организатор аукциона: открытое акционерное общество «Барановичское производственное хлопчатобумажное объединение» (ОАО «БПХО», г. Барановичи, ул. Фабричная, 7.

Прием заявлений и документов на участие в аукционе принимаются в рабочие дни с 9.00 до 12.00 и с 14.00 до 17.00 по адресу: г. Барановичи, ул. Фабричная, 7, каб. 602. Последний день подачи заявлений на участие в аукционе – **18.02.2016**.

Задаток вносится до подачи заявления на участие в аукционе на р/с 3012605450052 в отделении ОАО «АСБ Беларусбанк», код 150501245, получатель платежа – ОАО «БПХО», УНП 200166488. **Шаг торгов – 5 процентов.**

Победителем аукциона признается участник, предложивший наивысшую цену. Срок заключения договора купли-продажи – не позднее 10 рабочих дней со дня подписания (утверждения) протокола о проведении аукциона. Сроки оплаты за предмет аукциона устанавливаются при заключении договора купли-продажи с продавцом.

Победитель (единственный участник) аукциона в течение 3 рабочих дней после дня проведения аукциона (утверждения протокола) возмещает затраты на организацию и проведение аукциона в соответствии с Соглашением.

Дополнительную информацию можно получить у организатора аукциона: **(80163) 47-63-80, 47-64-93, 47-64-85.**

Гродненский филиал РУП «Институт недвижимости и оценки»

ИЗВЕЩАЕТ О ПРОВЕДЕНИИ ПОВТОРНОГО АУКЦИОНА ПО ПРОДАЖЕ ИМУЩЕСТВА

Наименование	Характеристика
ЛОТ 1	
